Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

САКАВІК 19 1933 г.
№ 61 (4605)
Год выданьня XVI

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Вузлавыя пытаньні калдагаворнай кампаніі. А. ДЖЭЛЮК — Вышэй сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму (2 і 3 стар.).
Барысаўская МТС сабатуе падрыхтоўку да сяўбы (1 стар.).
ТРЫБУНА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ—КОНЮХ, ЯК і ТРАКТАРЫСТ—ГЭТА ЗАРАЗ САМАЯ ГАНАРОВАЯ АДКАЗНАЯ ПАСАДА Ў КАЛГАСЕ (2 стар.). ДЭЛЕГАТЫ АБ СВАЕЙ РАБОЦЕ (3 стар.).
КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ: УЗЬДЗІН, ІГОЛЬНІКАЎ — Брак плыве па канвэры (4 стар.).
ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (4 стар.).
ЗА МЯЖОЙ:
Супроць фашыцкага тэрору ў Германіі (1 стар.).
За кулісамі японка-кітайскай вайны (1 стар.).
Падрыхтоўка да наступленьня на Манголію (1 стар.).
Антываенны рух у капіталістычных краінах (1 стар.).
Польска-данцыгскі канфлікт абвастраецца (1 стар.).

ВУЗЛАВЫЯ ПЫТАНЬНІ КАЛДАГАВОРНАЙ КАМПАНІІ

Зацьвярджэньня партыяй і ўрадам асноўныя паказальнікі пляну першага году другой пяцігодкі народнай гаспадаркі БССР патрабуюць упартай, баль шавіцкай, масавай работы партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый і ўсяго рабочага калектыву Савецкай Беларусі.

Магутнейшым вагаром мабілізацыі пралетарскіх мас на справу выкананьня народна-гаспадарчага пляну 1933 году зьяўляюцца калектыўныя дагаворы.

Калектыўны дагавор на сацыялістычных прадпрыемствах—двухбаковыя абавязацельствы, якія дакладна і канкрэтна ўстанаўляюць задачы і абавязкі гаспадарнікаў, з аднаго боку, і рабочых і служачых—з другога.

Гаспадарча-палітычнае значэньне калектыўных дагавораў і ў тым, што яны закранаюць самыя жыцьцёвыя інтарэсы вытворчасьці і рабочых мас, прасякаюць ва ўсе поры народнай гаспадаркі і грамадзкага жыцьця савецкай краіны.

Цэнтральная задача народна-гаспадарчага пляну 1933 году—выкананьне якасных паказальнікаў на ўсіх участках разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва. Узьвяць прадукцыйнасьць працы ў прамысловасьці БССР у 1933 г. на 13,5 проц., зьнізіць сабекошт па Наркамлёгпраме на 3 проц., Наркамцяжпраме на 7,6 проц., Наркамзнабу на 2,2 проц., палепшыць якасьць прадукцыі, — вось асноўныя лічбовыя контуры якасных паказальнікаў пляну 1933 году.

Барацьба за выкананьне гэтых паказальнікаў ёсьць цэнтральнае, вядучае зьвяно ў калектыўным дагаворы 1933 г.

Студзеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б зварачае асаблівую ўвагу на якасныя паказальнікі і прапануе **«ўсім гаспадарчым, партыйным і прафсаюзным арганізацыям сканцэнтраваць у 1933 годзе галоўную ўвагу на поўным выкананьні заданьняў па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы і зьніжэньні сабекошту, ступень ажыцьцяўленьня якіх будзе ў першую чаргу ўлічвацца пры ацэнцы дзейнасьці кожнага прадпрыемства і трэсту».**

Апублікаваныя пастановы гаспадарчых наркаматаў і прафсаюзных арганізацый СССР і БССР аб калдагаворнай кампаніі даюць выразныя, канкрэтныя ўказаньні аб правядзеньні гэтай масава-палітычнай кампаніі.

Гэтыя пастановы абавязваюць аб'яднаньні і ЦК саюзаў, дырэктароў фабрык і ФЗМК разгарнуць масавую работу па мабілізацыі рабочых ІТР на распрацоўку канкрэтных мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі сыстэматычнае павышэньне прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту і палепшэньне якасьці прадукцыі.

У калектыўным дагаворы гэтыя агульныя паказальнікі павінны быць выразна канкрэтызаваны для кожнага прадпрыемства, цэху ў гасобку. Павінны быць выразна ўказаны арганізацыйныя, тэхнічныя, рацыяналізатарскія, тарыфна-эканамічныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць выкананьне якасных паказальнікаў народна-гаспадарчага пляну.

Прадукцыйнасьць працы—гэта ў канчатковым выніку самае важнае, гэта вузел усіх гаспадарчых ніцей, гэта сынтэтычны паказальнік, па ім правяраецца якасьць работы ўсяго прадпрыемства.

Аснова ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы—тэхнічнае нармаваньне. Навукова-ўпрунтаваныя тэхнічныя нормы ёсьць рашаючы фактар сацыялістычнай арганізацыі працы і вытворчасьці. Пастаноўка тэхнічнага нармаваньня і тэхнічны інструктаж—важнейшыя вагары ў справе асваеньня новай тэхнікі. **Таму правільная пастаноўка тэхнічнага нармаваньня—важнейшае зьвяно калдагаворнай кампаніі.**

Паставіць на належную вышыню справу тэхнічнага нармаваньня, перагледзець у першую чаргу пашчаныя нормы, не адкідваючыя тэхнічна-вытворчым умовам, якія зьмяніліся на асьнове новай тэхнікі,—вось вузлавыя ў гэтай галіне задачы калдагаворнай кампаніі.

Пастаўленае на навуковай аснове тэхнічнае нармаваньне зьяўляецца за рукай правільнага правядзеньня палітыкі партыі ў галіне заработнай платы.

Народна-гаспадарчым пляном 1933 году рост сярэдняй зарплаты вызначан у 4,7 проц., у тым ліку па прамысловасьці 4,7 проц. Першыя ўрадам, апрача гэтага павялічэньня зарплаты, асыгнуюцца сумы на: 1) палепшаньне камунальнага будаўніцтва —13.480 тыс. руб., 2) ахову працы і тэхніку бясьпечнасьці—617,4 тыс. руб., 3) на паляпшэньне харчовай базы—2.180 тыс. руб.

Гэтыя мерапрыемствы яшчэ больш паляпшаюць умовы рабочага і даюць поўную магчымасьць выкананьня пляну па прадукцыйнасьці працы.

Час ужо сапраўды пакончыць з нашым гаспадарнікам і арганізатарам з разбазараньнем фонду зарплаты, з пашырэньнем тарыфнай сеткі. **Ня можа быць гутаркі аб агульным павышэньні зарплаты, што магло-б прывесьці толькі да рэцэдываў дробнабуржуазнай ураўнілаўкі, да гэтага часу яшчэ не дабітай.**

Правільныя суадносіны паміж прадукцыйнасьцю працы і заработнай платай, барацьба з ураўнілаўкай шляхам выдзяленьня ў аплаце вядучых катэгорый, а таксама рабочых на гарачых, цяжкіх і шкодных работах, усямернае пашырэньне пераходу на зьдзельшчыну,—вось спрыяльныя ўмовы для калектыўнага дагавору 1933 году.

Пастановы гаспадарчых наркаматаў і прафсаюзаў сурова пераследуюць нізкаэфэктыўныя гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі, што **«ўжываньне норм аплаты працы, не прадугледжаных калдагаворам, адступленьне ад тарыфна-кваліфікаваных даведачнікаў і сетак, свавольле ў адносінах да правядзеньня зьвышчасовых і акордных работ павінны разглядацца, як растрата дзяржаўных сродкаў, з прыцягненьнем вінаватых аж да крымінальнай адказнасьці».**

У калдагаворы пляну першага году другой пяцігодкі павінны знайсьці месца зусім канкрэтныя мерапрыемствы і асьцвячаючыя адносіны рабочага спажываньня і ЗРК для арганізацыі пашырэньня ўласнай харчовай базы, арганізацыі гарадзкіх гаспадарак, рыбаўпушкагадоўлі, малочных ферм, сьвіна-адкормачных пунктаў.

Вагары для гэтага ў прадпрыемствах ёсьць, трэба толькі па-бальшавіцку іх скарыстоўваць.

Асаблівае значэньне ў калдагаворнай кампаніі павінна мець **сацыялістычная дысцыпліна працы**, самая непахісная барацьба з прагуламі і іх посьбітамі, як дэзарганізатарамі нашай вытворчасьці.

6 гістарычных умоў тав. Сталіна—гэты магутны вагар, што забясьпечвае выкананьне нашых плянаў,—павінны быць цэнтральным зьвяном у калдагаворнай кампаніі.

Перазаключэньне калдагавораў і перагляд норм выпрацоўкі ператорвым у шырокую масавую палітычную кампанію, якая-б мабілізавала пралетарскія масы на поўнае выкананьне народна-гаспадарчага пляну 1933 году. Часу засталося вельмі мала. **Да 1 красавіка 1933 году павінны ўжо быць перазаключаны дагавары па ўсіх прадпрыемствах.**

Прафсаюзы зьверху да нізу павінны разгарнуць масавую работу па перазаключэньні дагавораў, папулярызуючы пры гэтым пастановы студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсесКП(б) аб задачах пляну першага году другой пяцігодкі.

Прафсаюзным арганізацыям ва што-б там ні стала трэба выкананьць пастановы наркаматаў і УсесЦСПС аб пасылцы кіруючых работнікаў-інструктароў, а па лініі гаспадарчых арганізацый—іх кіруючы склад, непасрэдна на прадпрыемства на ўвесь тэрмін перазаключэньня калектыўных дагавораў.

Толькі так можна ажыцьцяўляць сапраўднае, бальшавіцкае, сыстэматычнае, апэрацыйнае, канкрэтнае кіраўніцтва гэтай важнейшай палітычна-масавай кампаніяй.

СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ У ГЕРМАНІІ

Пратэсты пралетарыяту Францыі, ПАЗШ, Швэйцарыі

ПАРЫЖ, 16. З Мадрыду паведамляюць, што па ўсёй **Гішпаніі** адбываецца хваля пратэстаў супроць фашыцкага тэрору ў Германіі. **Германскае пасольства** ў Мадрыдзе закідваецца штодзённа лістамі і тэлеграмамі рабочых і сялянскіх арганізацый, у якіх яны пратэстуюць супроць фашыцкага тэрору і салідарызуюцца з рабочай клясай і кампартыяй Германіі. **Перад будынкам германскага консульства ў Мадрыдзе, Вільбао, Барсэлёне і Сэвільі адбыліся рабочыя дэманстрацыі.**

***

НЮ-ЕРК, 16. **«Федэрацыя рэвалюцыйных пісьменьнікаў»** прыняла рэзалюцыю аб падтрыманьні барацьбы германскіх працоўных мас і камуністычнай партыі. У рэзалюцыі гаворыцца, што **германскія нацыянал-сацыялісты**, ня гледзячы на тэрор, забойствы і арышты, ня ў стане задушыць камуністычную партыю і рэвалюцыянізаваныя пласты радавых сацыял-дэмакратаў. Рэзалюцыя падкрэсьлівае няўхільнасьць адкрытай грамадзянскай вайны ў Германіі.

ВЕНА, 16. Па паведамленьні з Швэйцарыі, у **Базэлі** ў знак пратэсту супроць вывешанага нацыянал-сацыялістамі сьцягу, дэманстравала некалькі соцень рабочых, пад кіраўніцтвам камуністаў. З прамовай па дэманстрантаў выступіў кіраўнік швэйцарскай кампартыі **Пфэйфэр. Паміж паліцэйскімі, якія прабавалі разагнаць дэманстрантаў, і рабочымі адбылася сутычка**, у рэзультаце якой некалькі чалавек паранена і 10 чалавек арыштавана.

ЗА КУЛІСАМІ ЯПОНСКА-КІТАЙСКАЙ ВАЙНЫ

КАПЭНГАГЕН, 17. Дацкая газэта «Дагенс Ніхэдэр», прыступаючы да вывучэньня становішча, якое стварылася на Далёкім Усходзе, піша: «Пры набліжэньні новай вайны ўсхваляванае чалавецтва замест таго, каб пытаць «чаму?», павінна сфармуляваць гэта пытаньне так: «для чыёй выгады?» Калі прыгледзіцца добра да кожнай новай вайны, — піша газэта, — дык заўсёды выявіш якога-небудзь караля нафты, сталі або фінансаў, якога-небудзь Захарава, або Дэтэрдынга, зацікаўленых у павялічэньні сваіх даходаў за кошт ваенных прыбыткаў. Вядома, што вайна паміж Балівіяй і Парагваем — гэта бойка паміж «Роял-Шэл» і «Стандарт Ойль». **Ну, а канфлікт на Далёкім Усходзе, для каго ён створан і на чыю карысьць ён ідзе?»**

Можна з поўным правам спытаць: хто дыктуе сваю волю токійскаму ўраду і карыстаецца такім уплывам, што прымушае краіну верыць, быццам будучае Японіі залежыць ад новай пераможнай вайны? Гэты ўсемагутны ўладар, — адказвае «Дагенс Ніхэдэр», — ня хто іншы, як барон Хадірумон Міцуі, гаспадар і распарадчык видомага канцэрну Міцуі.

Барон Міцуі — самы буйны фабрыкант зброі на Далёкім Усходзе, самы буйны ў сьвеце вытворца штучнага шоўку і самы багаты ў сьвеце чалавек. Ён пануе ў вытворчасьці сталі, самалётаў, у здабычы і продажы нафты, яму належаць буйнейшыя банкі, ён кантралюе рудні, заводы, чыгункі, газэты, гандлёвыя таварыствы і г. д. Яго інтарэсы не абмяжоўваюцца Японіяй, філіялы яго фірмы знаходзяцца ў Карэі, Кітаі, Індыі-Кітаі, Індыі, Манчжурыі, на Філіпінскіх і Гавайскіх астравах і нават у Амэрыцы. Падобна да ўсіх магнатаў капіталу, барон Міцуі фінансуе паўстаньні, стварае народныя рухі, арганізуе міжнародныя інтрыгі. Існуе думка, што ён дапамагаў арганізацыі ў Кітаі антыяпонскага байкоту для таго, каб абвастрыць японска-кітайскія адносіны і справакаваць захват Манчжурыі.

Дынастыя Міцуі, не перастаючы павялічваць сваё вялізнае багацьце, усімі сіламі садзейнічае імпэрыялістычнай экспансіі Японіі. За кулісамі усіх войнаў, якія Японія вяла ў апошняе стагодзьдзе, пазнаецца дзейнічаў уплыў Міцуі. Гэта Міцуі былі аўтарамі першай японска-кітайскай вайны, гэта яны падрыхтавалі і ажыцьцявілі вайну супроць Расіі, захват Карэі і Манчжурыі. Гэта, нарэшце, фірма Міцуі будуе цяпер пляны захвату Усходняй Сібіры, Філіпін і г. д.

КІТАЙЦЫ ЗАХАПІЛІ 18 ЯПОНСКІХ ГАРМАТ і 7 ТАНКАЎ

Крывавыя баі ля Вялікай сьцены

БЭЙЛІН, 14. У кітайскім паведамленьні аб падзеях у Жэхэ гаворыцца: «на фронце **Губзыкоў** нашы войскі, як і раней, займаюць пасьцыю супроць праціўніка ў раёне **Нанцзянлін**; сёньня тут становішча параўнальна спакойнае.

Праціўнік, які знаходзіўся за **Сыфынкоу** 2 сакавіка вечарам пачаў атакаду з боку ваенных часьцей генэрала Сун-Чко. Пры гэтым, было захоплена 7 танкаў, 18 гармат, 5.000 вінтовак, узята ў палон больш за 500 чал. і перахоплен загад камандыра брыгады **Хаторы** аб абавязковым, на працягу двух дзён, заняцьці **Лычкоу, Сыфынкоу, Лунзінґуан і Губзікоу.**

На фронце **Лынкоу** нашы войскі —гаворыцца далей у кітайскім паведамленьні—працягваюць моцна трымаць свае пазыцыі ў раёне **Сунцзянінзі**, а войскі праціўніка з Сунчжуана зараз рухаюцца на поўнач з мэтай падрыхтоўкі да новага нападу.

Праціўнік, які знаходзіцца ля **Цзелінкоу**, за апошні час абстрэльвае нас непарэўна моцным агнём. Адначасова робяць на нас напады часьці брыгады Сяофана».

ТОКІЁ, 16. Паведамляюць, што 15 сакавіка японцы заняли Фоелай (пункт на паўночны Захад ад Сыфынкоу. Кітайцы, атрымаўшы ловы падмацаваньні з паўночнага Кітаю, атакавалі Цзяньмінгуан (на ўсход ад Сыфынкоу). Паводле слоў «Сімбун Рэнпа», у баёх пад Цзяньмінгуанем, якія яшчэ ня скончыліся, японская артылерыя зьнішчыла кітайскі полк, але і японскія войскі нясуць сур'ёзныя страты.

***

ШАНХАЙ, 17. Як паведамляе кітайскае агенцтва «Гоміп», войскі Сен-Муаня акружылі японскі атрад, дзейнічаючы на поўначы ад **Сыфынкоу.** 14 японская дывізія, прыбыўшая ў якасьці падмацаваньня, па словах агенцтва, перайшла ў контр-атаку, якая была з посьпехам адбіта кітайскімі войскамі. Кітайскі друк паведамляе аб новых баёх, з пераменнымі посьпехамі, у раёне Лохатун, а таксама ў раёне Зэміньчжай (на поўначы ад Шанхайгуаня). Па паведамленьні таго-ж агенцтва, коньніца з войск правінцыі Шансі пачала прасоўваньне ў Жэхэ праз правінцыю Чахар (унутраная Манголія) для падтрыманьня войск Сун Цзянь-ліна, які знаходзіцца ў раёне Вэйчана.

Падрыхтоўка да наступленьня на Манголію

Пагроза пашырэньня вайны на Манголію і па гэты бок Вялікай сьцяны ўсё абвастраецца.

Японскі генштаб ужо паслаў Цянь-цзінскім уладам ультыматум, патрабуючы адводу кітайскіх войск на 32 кілёмэтры ад гораду.

Гэты ультыматум зьяўляецца прэлюдыяй да наступленьня японскіх войск на Цянь-Цзінь, сканцэнтраваных у Шанхай-Гуані, і да маючага адбыцца дэсанту японскіх войск у порце Таку, які знаходзіцца пад жэрламі ваенных караблёў.

Японскія войскі пад флянгавым прыкрыцьцём мангольскай кавалерыі наступаюць на заходнюю мяжу Жэхэ ў напрамку мангольскай правінцыі Чахар.

Паводле чутак з Токіё, паміж уладамі Чахара і Манчжоу-Го вядуцца перагаворы аб стварэньні сэпаратысцкага руху, які мае мэтай аддзяленьне Чахара і далучэньне яго да манчжурскай калёніі.

Японцы арганізавалі ў Далай-Нор (горад, размешчаны па поўдні Хайляра, ля мяжы вызнанай Манголіі) мнімую «Мангольскую нацыянальную партыю», якая абвясьціла «незалежнасьць» Чахара. Гэта партыя складаецца выключна з ламаў, выгнатых з Народнай Мангольскай Рэспублікі і падтрымліваючых іх рускіх белагвардэйцаў.

Такім чынам падрыхтоўваецца наступленьне на Манголію, наступленьне, якое павялічае небясьпеку антысавецкай агресіі.

«Юманітэ».

Пралетарыят Японіі ў барацьбе супроць войны

Японскі пралетарыят пад кіраўніцтвам кампартыі Японіі выступіў супроць крайняй шавіністычнай прапаганды і зьдрады японскіх сацыялістаў, на барацьбу супроць імпэрыялістычнай вайны.

Ня гледзячы на страшэнны палітэйскі тэрор, японскія рабочыя даюць дасканалы прыклад сапраўднай барацьбы супроць вайны. На працягу апошніх двух тыдняў 2.000 камуністаў, у большасьці моладзі, было арыштавана за іх выступленьне супроць грабежніцкай вайны ў Манчжурыі. Яны таксама вельмі актыўна працуюць у радах армі, у такіх пунктах, як **Дайрэн, Мукдэн і Фушыма.** Ваеннымі ўладамі праведзены вобыскі ў казармах і на суднах.

«Юманітэ».

ПОЛЬСКА-ДАНЦЫГСКІ КАНФЛІКТ АБВАСТРАЕЦЦА

Данцыгскі сэнат заклікае да супакою і парадку

БЭРЛІН, 16. Данцыгскі карэспандэнт гутэнбэргскага друку паведамляе, што данцыгскі сэнат апублікаваў распараджэньне, у якім гаворыцца: «у сувязі з тым, што польскі ўрад не правёў у жыцьцё данага ім абяцаньня аб адкліканьні войск з Вэстэрплятэ, асабліва важна іменна цяпер захоўваць поўны спакой і парадак, таму, забараняюцца на неакрэсьлены час усякія палітычныя дэманстрацыі і сходы, нават у закрытых памяшканьнях. Распараджэньне мае сілу ў **Данцыгу, Цолапцы і Оры».** Карэспандэнт падкрэсьлівае таксама, што адносіны паміж Данцыгам і Польшчай абвастрыліся яшчэ больш з прычыны інцыдэнту, які адбыўся ўчора.

Учора данцыгскаму паліцэй-прэзыдэнту было адмоўлена ў праве на агляд Вэстэрплятэ. Адмаўленьне было матывавана тым, што ня было шчы магчымасьці прадастаўіць неабходнага для яго суправаджэньня польскага афіцэра.

ЯЎРЭЙСКІЯ ПАГРОМЫ Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 16. Польскі фашызм, скарыстоўваючы моцнае рэвалюцыйнае хваляваньне і голад, якія пануюць у бяднацкіх масах сялянства, імкнецца накіраваць гэта ў рэчышча яўрэйскіх пагромаў і грабяжоў. Як паведамляе «ПАТ», трэцяга дня ў радзе вёсак і мястэчак Жывецкага павету, Кракаўскага ваяводзтва, мелі месца антысэмітскія пагромы. У вёсках УЗЛАТКА і УНСОЛ ПАГРОМШЧЫКІ РАЗГРАМІЛІ 11 ЯЎРЭЙСКІХ КРАМ, у мястэчку ЦЫЛЮВЕ РАЗГРОМЛЕНА 10 КРАМ.

Антысэмітскія выступленьні мелі таксама месца ўчора ў **ВАРШАВЕ. У яўрэйскіх кварталах на вуліцах—ТВАРДОЙ, ДЗІКАЙ, ВОЛЬСКАЙ і інш. ФАШЫСТЫ ЗБІВАЛІ ПРАХОДЗЯЧЫХ ЯЎРЭЯЎ, БІЛІ ШЫБЫ Ў МАГАЗЫНАХ.** Спроба фашыцкага друку справакаваць новую хвалю пагромаў у Польшчы фармальна зьвяваецца з уздымам антысэмітызму ў Германіі. «Газэта Варшавска» б'е трывогу з прычыны масавага ўцяканьня яўрэяў з Германіі ў Польшчу і заклікае да рашучых мерапрыемстваў супроць яўрэйскай іміграцыі, якая нібы ўяўляе сабой новую пагрозу польскаму гандлю.

Антываенны рух у капіталістычных краінах

АНГЛІЯ. Па паведамленьні агенцтва «Рэйтэр», у палаце абшчын, у часе абмеркаваньня бюджэту морскага міністэрства, маладая жанчына зьявілася на «галярэі пэраў» і скінула ўніз лістоўкі зялёнага колеру, у якіх было напісана наступнае: «на вайну траціцца ўсё больш грошай, а эканомяць на асьвеце, жыльлёвым будаўніцтве і беспрацоўных, пакладзеце канец гэтай бязглузьдзіцы». На галярэі для публікі, размешчанай з другога боку будынку, зьявіўся мужчына, які таксама пачаў кідаць уніз вялікую колькасьць лістовак. Другая жанчына, на галярэі для публікі, пачала гучна пратэставаць супроць расходаў на вайну. Па словах агенцтва, такая арганізаваная дэманстрацыя мае месца ў першы раз у палаце абшчын за апошнія гады.

На мінулым тыдні кембрыджскія студэнты прынялі рэзалюцыю аб адмаўленьні змагацца за караля і бацькаўшчыну большасьцю галасоў супроць 90. Першую падобную рэзалюцыю вынесьлі АКСФОРДЗКІЯ СТУДЭНТЫ. СТУДЭНТЫ ПАЛІТЭХНІКУМУ Ў ЛЁНДАНЕ далучыліся да рэзалюцыі аксфордзкіх студэнтаў большасьцю 44 супроць 4. Антываенная рэзалюцыя была прынята таксама на канфэрэнцыі 23-х арганізацый саюзу работнікаў прылаўку ў ЛІВЭРПУЛЬСКАЙ АКРУЗЕ.

***

ФРАНЦЫЯ. У морской школе ў Брэсце (Францыя) арыштавана каля 50 слухачоў. У паведамленьні для прэсы морскі міністар пацьвердзіў, «што, у сувязі з антымілітарыстцкай прапагандай у школе, пачата сьледзтва і некалькі слухачоў, якія зрабілі ўчынкі, насумляшчальныя з нармальным функцыяна вальнем навучальных устаноў, ужо ізаляваны і чакаюць вырашэньня свайго лёсу. Сьледзтва працягваецца. Ужо ўстаноўлена, што галоўнымі вінаватымі зьяўляюцца два выкладчыкі і некалькі інструктароў. Першым прапанавана весьці прапаганду ў іншым месцы (г. зн. звольнены—РЭД.), а другія (інструктары—РЭД.), якія зьяўляюцца ваеннымі, будуць несьці адказнасьць перад сваім начальствам. Што-ж датычыць саміх слухачоў, якія карысталіся дармовым памешканьнем, харчаваньнем і навучаньнем, дык яны будуць накіраваны дамоў».

***

ПЭРУ. Паводле паступіўшых паведамленьняў, САКРАТАР КАМПАРТЫІ ПЭРУ ТАВ. РОБІНЕЦ ПРЫГАВОРАНДА СМЯРЦІ за герайчную актыўнасьць кампартыі Пэру ў барацьбе супроць вайны з Калюмбіяй. Усе члены Цэнтральнага Камітэту арыштаваны і зьбіты. Іх кінулі ў камэры, напаўненыя напоўненай вадой. Ужо некалькі дзён, як яны пачалі галадоўку.

7.000 палітычных зьняволеных прынялі ўдзел у пратэсьце супроць пастановы ўраду выслаць усіх палітзьняволеных на фронт у Літыцыю.

Кампартыя арганізуе ўсеагульную забастоўку супроць масавых палітычных арыштаў і вайны. Цяперашні тэрор супроць рэвалюцыйнага руху ня мае прэцэдэнтаў нават ва ўмовах паўднёвай Амэрыкі. Больш 3.000 паліцэйскіх і шпіёнаў паслана ўрадам на барацьбу з рэвалюцыйнымі арганізацыямі.

***

ІНДЫЯ. Унесеная ў парлямант Дэлі інтэрпэляцыя гаворыць, што пачынаючы з 1931 году на астравы Андаман выслана 2.136 палітычных асуджаных.

«ЮМАНІТЭ».

Барысаўская МТС сабатуе падрыхтоўку да сяўбы

На полі два адзінокія будынкі. Адзін з недабудаванай страхой. Тут стаяць трактары, жнэйкі і іншыя с.-г. машыны. У другім—гаручае і дробны інвэнтар. Навокал пуста і ціха. Заходзім пад навець, дзе стаяць трактары і машыны. Шукаем вартаўніка.

Нікога... Ні аднаго жывога чалавека. Прыходзь, бяры, што толькі хочаш—ніхто не затрымае. Хаваем частку ад трактара (рэчавы доказ) і ідзем шукаць дырэкцыю МТС.

Гутарка з памочнікам дырэктара МТС у канцылярыі станцыі:

— Ці ёсьць у вас вартаўнікі трактарнага парку?

— Зразумела...

— І яны пільнуюць?

— Чаму-ж не? Пільнуюць...

— ? ? ?

Паказваем узятую намі частку ад трактара.

Памочнік густа чырванее. Мінутнае замяшаньне, а потым адразу тысяча пытаньняў.

Па-першае—на станцыі сёньня дзень адпачынку (?!). Па-другое, ха ця МТС мае і двух вартаўнікоў, але «мы заўтра-ж пачынаем шукаць яшчэ двух, такім чынам, будзем мець цэлых чатыры»...

Далей, бясконцыя запэўненьні: справу выправім, ахову зараз-жа наладзім, варту, як сьлед, узмацнім і г. д. без канца.

Гутарка адбывалася днём. Увечары, як толькі сьцямнела, зноў ідзем да навецяй, праверыць, наколькі споўнены ранішнія абяцаньні памочніка дырэктара МТС.

На складзе—ні жывой душы. Трактары і машыны—без усякай аховы. Варты няма, як і днём—і з агнем ня знойдзеш.

Проста, ня верыш уласным вачом. Парашныя прыйсьці яшчэ раз ноччу.

12 гадзіна ночы. Мы зноў ля складу з трактарамі і машынамі. І зноў —вартаўніка няма. Для кулака-шкодніка, для злодзея дзьверы раскрыты.

Прозьвішча?! Прозьвішча чалавека, які так заклопатна, з такой агідней шай безадказнасьцю адносіцца да зробы дзяржаўнай маемасьці! Прозьвішча і імя дырэктара, у якога са стаў цы можна ў любую мінуту ўзяць любую дэфіцытную частку, вывезьці трактар, разабраць машыны і г. д!

Называем: гэта дырэктар Барысаўскай МТС **Холміч.**

Ён ужо даволі зарэкамэндаваў сябе як сабатажнік падрыхтоўкі да сяўбы. Яшчэ ў пачатку сакавіка Холміч атрымаў ад ЦК суровае партспагнаньне.

У адказ пасыпаліся ўрачыстыя абяцаньні выправіць памылкі, наладзіць рамонт, арганізаваць пільную ахову, адным словам... забясьпечыць, як гаворыць, каронны пералом.

Потым у цэнтральным друку зьявіліся трывожныя сыгналы аб тым, што МТС, як і раней, зрывае падрыхтоўку да сяўбы. Холміч зноў дае бясконцыя абяцаньні «ўсё наладзіць».

І нарэшце, як вынік усіх гэтых абяцаньняў і закліканьняў, факты, аб якіх мы гаварылі вышэй. Трактарны парк і машыны пакінуты на волю лёсу. Вартаўнікі знаходзяцца дзе хочаце, толькі не ля трактараў і машын.

Адным словам, паўтараем, прыходзь бяры дэфіцытныя часткі, вывазі трактары, разьбірай машыны, табе ніхто слова ня скажа, хоць бы з тэй простай прычыны, што і гаварыць нема каму, ля складаў і навецей з машынамі—ні душы.

Барысаўскі пасёлок, толькі і рабіў, што па некалькі разоў «сурова папярэджваў» работнікаў МТС аб неабходнасьці «зрабіць пералом». Але, як мы бачым, ад гэтых папярэджаньняў асаблівых урокаў кіраўнікі МТС ня вынесьлі. Таксама, яны ніякіх аб салютна ўрокаў ня вынесьлі са шкод ніцкай дзейнасьці мінулага кіраўніцтва МТС.

Вось прыклады: той жа Холміч заяўляў усіх, што дырэктыва пасёлкоў аб ачыстцы складу трактарыстаў ад клясава-чужых элемэнтаў выканана.

Праверэем. Правільна. Чыстка прайшла. Але каго вычысьцілі? З 12 вычышчаных вялізнута 6 бедняко— калгасьнікаў (гэта ўказана ў акце) і ніводнага чужака. Пра апошніх забылі.

Прыводзім «аргумэнтацыю» камісіі:

«Вычысьцілі Караля Яўгена (калгас «Батрак»), як недысцыплінаванага. Сахончыка Рамана (калгас «3-ці рашаючы») — нейважлівы да заняткаў, сьпіць на вуроках. Шатко Міхася, бедняка — да заняткаў дрэнна адносіцца, балуецца».

Хіба гэта аргументы?

Хіба гэта чыстка? Гэта насьмешка над ідэяй ачысткі радоў трактарыстаў ад клясава-чужых элемэнтаў, 1 пасьля гэтага, у Холміча хапае сьмеласьці заяўляць, што чыстка праведзена і даваць новыя абяцаньні, якім цяжка паверыць. Грош цана такім абяцанкам!

Возьмем рамонт с.-г. інвэнтару. Плугі, бораны адрамантаваны. Але як адрамантаваны? Самі-ж камуністы — работнікі МТС, гаворыць: «адрамантаваны на чорную руку». А хто кіруе гэтай справай? Старэйшы мэханік, член партыі **Насевіч**, які сам зрывае працоўную дысцыпліну. Зірнеце ў май старню, дзе рамантуюць інвэнтар. Вы там убачыце, як цэлымі днямі людзі мітусяцца, ня ведаюць, што рабіць, гультайнічаюць, сядзяць і курыць цыгаркі. Ня дзіўна, што рамонт інвэнтару робіцца, абы з рук збыць, а некаторыя часткі да плугоў зусім згублены.

Характэрны факт. Кіраўнікі МТС да гэтуль не забралі 16 тыс. руб., якія выданы ім у кредыт на рамонт трактараў.

— Нам грошы зараз не патрэбны, — кажа дырэктар. Вось вам новы прыклад злачынна-бястурботных, бездаказных адносін да важнейшага дзяржаўнага заданьня.

Няма нічога дзіўнага ў тым, што МТС дагэтуль абсолютна ніякай работы не праводзіць у калгасах. У «Зьвязьдзе» паведамлялася ўжо, што вучастковыя работнікі МТС Гульцоў, Марашук, Кітраном Тышкевіч вядуць падрыўную кулацкую работу ў калгасе. З гэтымі кулацкімі агентамі лібералынічаюць, ня зьнімаюць з работы.

Зразумела, пасьля гэтага, чаму калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, зусім дрэнна падрыхтаваліся да восеннавой сяўбы. Ёсьць калгасы (Навасельскі, Нечкавіцкі сельсаветы), якія яшчэ зусім ня ссыпалі насенных фондаў. Плян вызазкі гною выкананы на 20-23 проц. Замест 3.700 тон насеньня пратручана 1.557 тон. Лічбы даволі пераканаўчыя!

На станцыі Прылукі ляжыць ля двух вагонаў капітовых мінэральных угнаеньняў, і ні адзін калгас іх не вывозіць. МТС, нават ня ведае, які калгас ня вывез сваю норму мінэральных угнаеньняў. Калгас «Рой», Міатчанскага сельсавету, вывез 32 тоны фасфарытнай мукі, расьпісаўся, уплаціў і...ссыпаў угнаеньне на дварэ аднаго кулака, ля самой станцыі. На гэтыя шкодніцкія справы ніхто не рэагуе. Пра іх нібы ня ведаюць.

Пад носам у МТС, у Лошыцкім калгасе «Хваля рэвалюцыі» загноена жыта, раскрадзена 80 пуд. гароху, пасавана 250 пуд. сена. Старшыня калгасу Гаўрыльчык Антось (член партыі) адкрыта заяўляе: «Нішто, з нас хопіць таго, што застаецца». Ніхто не рэагуе на такія кулацкія выбрыкі.

Нас прышлося прысутнічаць на куставым оходзе партячэек, які адбываўся ў МТС. Выступаў, між іншым, кіраўнік Прыяменскай фэрмы — член партыі.

З вясёлай ухмылкай, зусім спакойна, ён гаварыў аб тым, што насеньня не хапае, што вывезена толькі 25 проц. гною, што кармамі фэрма не забясьпечана, што чыстка фэрмы не праведзена і паогул чужакоў у іх няма.

— Хто ў вас ахоўвае насенныя фонды? — запыталіся калгасьнікі.

— Вартаўнікі? Адзін урадзік, а другі былы гандляр.

— А як-жа ты гаворыш, што няма ў вас клясава-чужых элемэнтаў?

— Кіньце. Які ён вораг, калі пятнаццаць год назад быў урадзікам, — махнуў рукой «камуніст».

Вось вам кулацкі твар кіраўніка фэрмы. Ня дзіўна, што ў Прыяменскай фэрме знайшоў сабе прытулак пракулыцыцкі Менжынскі, выгнаны з МТС.

Што можна дадаць да ўсяго гэтага? Кіраўніцтва Барысаўскай МТС не спрабілася са сваімі абавязкамі. Яно павінна быць адноўлена. У гэтым заруку перабудовы работы і пасьпяховага завяршэньня падрыхтоўкі да сяўбы.

А. Сучкова.

Якасьць рамонту іх ня турбуе

РАГАЧОЎ. Рагачоўская МТМ ня выканала ў тэрмін баявога заданьня партыі аб рамонце трактараў. Замест 92 трактараў дагэтуль адрамантаваны 61, што складае 66 проц. Партячэйка на чале з сакратаром тав. **Сучковым** недаацаніла палітычнага значэньня своечасовага скончаньня рамонту і не забясьпечыла правільнай расстаноўкі партыйных сіл на рашаючых участках работы. Партмасавая работа ў цэхах і брыгадах не праводзілася.

Возьмем для прыкладу 2 брыгады — **Клімава і Царыка** (абодва камуністы). Брыгада Клімава ўзяла на сябе абавязак штодзённа рамантаваць два маторы, брыгада Царыка абавязал

ТРЫБУНА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Конюх, як і трактарыст—гэта зараз самая ганаровая і адказная пасада ў калгасе

ПРАЦАВАЦЬ, ЯК КОНЮХІ ЯКУБОВІЧ, ПАПЕЛІН, ШЫРОКІ, ЗЕЛЯНКОУ

Л. Зелянкоў

Конюх-ударнік калгасу „Замасточча"

Ледзь золак...

Ледзь золак, як я ўжо на стайні. Даю сваім коням сена. Раніцой усе шэсцьдзесят коней, загадзя пачышчаныя і замеджаныя, стаяць на вадапой. Пасьля мыцьця коні адпачываюць, а раніцай—ежа работу.

Як толькі скончыцца работа, я даю коням корм паводле цьвёрдай нормы. Чыстку рабіць акуратна праз пэўны час. Так кожны дзень. У мяне ўстаноўлен, як закон, такі парадак: перш чым пачнецца работа праводзіцца агляд кожнага каня. Потым аглядзе ны конь дасцца калгаснику, які яго працуе. Пасьля работы—зноў самы суровы агляд і яго менш суровая прыёмка.

Адзоль і вынікі. У нашым калгасе больш яшчэ 3 брыгады, але хіба мож на параўнаць іх коней з коньмі маёй брыгады. Там ёсьць і замуленыя, і заезджаныя, адным словам адразу відаць, што гаспадарскага вока німа.

Адпойны прывялі (правільней гаворачы, прывезьлі) да мяне з першай брыгады аднаго старога, пакалоту жывога каня. Конь гэты ледзь дыхаў. Палядзеў я на яго, падумаў і лепшай назвы, як «Тупіца», не знайшоў. Але што-ж, думаю, нельга, каб конь марна загінуў.

І вось я пачаў «Тупіцу» даглядаць. Штодзённа чысьціў, карміў даваў лепшыя, паіў сваячасова. Прыбыў конь пад маім доглядам менш трох тыдняў, а цяпер аж падбрыквае. Не пазнаць каня. Вось вам і «Тупіца».

Няма нічога дзіўнага, што ў маёй брыгадзе коні добрыя. Дрэнных коней няма. Ёсьць толькі дрэнныя гаспадары, дрэнныя конюхі. Калі ты конюх, калі табе калгас даверыў сваіх коней, дык працуй сумленна, даглядай як сьлед кожнага каня і ўсё будзе добра.

Сэрцам трэба балець за калгасных коней. Вось я быў выбран на раённы зьлёт калгаснікаў-ударнікаў. Ну, зразумела, паехаў. Але на зьлёце ўвесь час думаў, як там мае коні, ці даглядаюць іх як трэба. Спачатку нават і ехаць не хацеў, рознае, думаю, бывае. Шчыра кажучы, я проста баяўся коней сваіх пакінуць ад іных.

ВІЦЕБСКІ раён.

В. Якубовіч

Конюх-ударнік камуны „Праца"

Як я даглядаю каня

У камуне я з 1928 году. Прыйшоў туды з Чырвонай армії. Мне, як былому чырвонаармейцу-кавалерысту, праўленьне камуны даручыла догляд коней. Першыя два гады я гэту работу выконваў выключна ў зімовы перыяд. Летам працаваў на полі разам з іншымі камунарамі.

Апошнія два гады працую выключна на конюхам. Пасьля пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да сяўбы за мной замацавалі пяць пар коней. Гэтыя-ж коні замацаваны за асобнымі камунарамі, якія на іх працуюць зараз і будуць працаваць усё лета.

Вопыт, які я атрымаў у Чырвонай армії на доглядзе каня, перанёс і ў калгасу. Гэтым вопытам я і падзялю сь.

Перш-на-перш я ўстанавіў цьвёрды распарадак кармленьня і паеньня коней. Па прыезьдзе з работы я прымаю коней ад кожнага камунара, стаўлю іх у станкі і закладваю вызначаную норму канцэнтраты або цімафееўкі.

Праз некалькі гадзін—паю. Пасьля паеньня праглядаю кармушкі і дабаўляю корму.

У тры гадзіны ночы зноў іду на стайню і закладваю поўную норму кармоў. А 6-ай гадзіне раніцы паемь не, дабаўляю таксама корму. У абедзены перапынак зноў кармлю і паю. Такім чынам, пры мне коні атрымліваюць корм фактычна пяць раз у суткі і тры разы поўнага.

Я ўстанавіў цьвёрды распарадак чысткі коней і ўборкі станкоў і стайні. Па маёй прапанове праўленьне абавязкала кожнага камунара чысьціць коней кожны дзень. Чысьцяць раніцой перад паеньнем.

Треба сказаць, што гэта справа была наладжана не адразу. Некаторыя камунары часта не прыходзілі на стайню для чысткі. Але я аб такіх камунарах адразу-ж даклаўваў праўленьню. Перад імі было пастаўлена пытаньне рубам. Зараз ужо мы ня маем ні аднаго выпадку, каб той ці іншы камунар не зьяўляўся на чыстку сваіх коней.

Гной са станкоў я выкідваю праз кожныя два дні. Праход стайні вычышчаю кожны дзень. На праходзе ў мяне вы ня знойдзеце ніводнай саломінкі.

Каб павысіць адказнасьць за каня з боку кожнага камунара, я устанавіў такі парадак: па прыезьдзе з работы стараннра аглядваю кожнага каня і калі ўбачу, што конь мокры або сьпіча нага ці сьпіна, адразу-ж дакладваю аб гэтым праўленьню. І трэба сказаць, што калі раней такія зьявішчы былі, дык зараз яны зьнішчаны.

Так стаіць справа ў мяне з догляду і кармленьнем даручаных мне коней. Па маёй рабоце разлічваюцца і іншыя конюхі нашай камуны. У выніку, уся цягавая сіла камуны нясьпу сустракае сытай і здаровай. Праца, тры разы ў дзень пастаўленая на адпачынак. Гэта таму, што яны па сваім узросьце старыя і за час зімовай работы крыху аслаблі.

Правільна падагнаць збрую да кожнага каня—вельмі важная рэч у справе захаваньня конскага пагалоўя. У нас у камуне ў гэтых адносінах устаноўлены такі парадак:

За кожным канём замацован поўны камплект збруі, прычым уся яна знаходзіцца на руках у конюхаў. Пры запрагальні коней кожны камунар атрымлівае збрую ў конюха, а ўвечары зноў здае яе назад разам з канём. Гэта стымулюе адказнасьць ка мунараў за захаванасьць збруі.

Я добра ведаю, што зараз азначае конь для калгасу і наогул для краіны. А таму даручаную мне камунай работу выконваю добрасумленна і з вялікай ахвотай.

Люблю каня. З ім я звыкся яшчэ да Чырвонай армії, калі працаваў на вёсцы. Чырвоная армія яшчэ больш навучыла мяне, як трэба адносіцца да каня.

ЕЛЬСКІ раён.

С. Таўсты

Ударнік калгасу „Пралетар"

Даем калгаснае слова

Больш за ўсё мяне цікавіць пытаньне, якое паставіў наш правадыр тав. Сталін — зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі. Правільна наш правадыр маркуе. Гэта зусім магчымая рэч. За прыкладамі далёка хадзіць ня трэба.

Вось працуе ў нас калгаснік **Майстраў Уладзімер.** Пастухом ён быў раней, атрымліваў капейкі, якіх яму не хапала на жыцьцё. Заўсёды Майстраў хадзіў абадраны, абшарпаны.

У калгасе Майстраў з першага-ж дня аддаўся рабоце. Адным з лепшых ударнікаў стаў. Зразумела, за сваю працу ён атрымаў колькі яму належыць. Зарабіў ён за год 170 пудоў бульбы, 60 пудоў аўса, 52 пуды грэчкі, 400 руб. прапыма ды яшчэ іншых прадуктаў.

Ня было гэтага ў яго раней ніколі.

Набыў сабе Майстраў добрыя боты, апрануўся. Сьвятлей і весялей стала ў яго хаце.

У гэтым годзе ў нашым калгасе на працадзень выпла па 1,65 кгр. збожжа, 3,7 кгр. бульбы, 1 кгр. сена, 500 грам саломы і прапыма па 1 р. 65 к. У сваіх гаспадарках у нас такіх даходаў ня было.

Прыступаючы да веснавой сяўбы, мы станім перад сабой задачу — атрымаць сёлета ў два разы больш, чымся ў мінулым годзе.

На сёнешні дзень мы поўнасьцю сабралі насенны і страхавы фонды. Вывезьлі 709 тон гною. Рыхтуемся да вясны па-ўдарнаму.

Гэта бачаць і аднавасобнікі. Яны ведаюць, што іх шлях вядзе да нас, у калгас. За час падрыхтоўкі да сяўбы ў наш калгас уступіла 59 гаспадарак.

Ёсьць і недахопы, утойваць іх ня трэба. У нас ніадобра з цягавай сілай. Каня мы яшчэ дрэнна даглядаем. Але мы даем калгаснае слова: **«Возьмемся і за гэта. Будзе ў нас да вясны моцны і здаровы конь. Абавязкова будзе!**

У калгас я ўступіў у 1931 г. За сумленную работу мяне выбралі брыгадзірам.

За ўвесь час я ня меў ніводнага прагулу, ніводнага нявыхаду на работу. За ўдарніцтва, за добрыя адносіны да працы я прэміраваны.

Зараз выбраў мяне калгас дэлегатам па ўсебеларускі зьезд калгаснікаў-ударнікаў.

ГОМЕЛЬСКІ раён.

А. М. Папелін

Конюх-ударнік калгасу імя Калініна

Узаемны кантроль

Я стары калгаснік. Уступіў у арцель у 1921 годзе. Вось з таго часу і працую ў калгасе.

У той час у нашай гаспадарцы былі коні пакалоту жыцьця, разьбітыя калёсы, з адных вузлоў пастроікі, з дзесяткаў кавалкаў лямцы да хамутоў. Едзеш бывала—калёсы рыпяць, гойталоцца, так і глядзі разваліцца ўсё. І коні такія, што вось, вось стануць.

Ад гэтых коней у нас і сьледу не засталося. Коні зараз нібы тыя лялькі. Ня стрымаеш! Усе калёсы на жалезным ходу. Усе хамуты новыя, ці адрамантаваныя так, што і не пазнаеш—новы ён ці стары.

Я конюхам пачаў працаваць. Быў раней брыгадзірам, паляводам. А потым, калі ўбачыў, што коні усё-ж у нас даглядаюцца дрэнна, пайшоў па стайню.

Галоўнае, па-мойму, у доглядзе каня—гэта ня толькі яго своячасова накармліць, напаіць, пачысьціць, гной з-пад яго прыбраць, палоўнае, каб яго не перагрузіць, ня змуліць, не перагнаць на рабоце.

А для гэтага треба, каб кожны калгаснік цаніў і берог каня, як свайго лепшага таварыша. Наша праўленьне было ў мінулым годзе дапусьціла памылку. Калі ў горад вазілі бульбу, дык вызначылі аплату калгаснікам з пуда. За кожны адвезены пуд бульбы вызначалі сем сотак прададня. Ну і зразумела, кожны імкнуўся як мага болей накласьці, ня ўлічваючы, ці можа столькі конь павезьці ці не, толькі-б болей зарабіць.

Прайшоў адзін, другі дзень, глядзку—коні пачалі здаваць. Я да калгаснікаў: што-ж вы, браткі, робіце, вы-ж так, кажу, усіх коней загоніце. І самі возчыкі—калгаснікі гаварыць, што дрэнную пастанову вынесла праўленьне.

Я на праўленьне. Скасавалі гэту пастанову. За пару тыдняў паправілі ўсіх коней. Зараз ужо такі выпадак больш не паўторыцца. Бо калгасьнікі зразумелі, як трэба берагчы каня. Папрабуйце зараз сказаць любому калгаснику, каб ён паклаў на каня болей, чым можа конь павезьці, ён вам так запяе, толькі трымайцеся!

Я даглядаю рабочых коней. Праз гутаркі з калгаснікамі я дабіўся таго, што за ўсю зіму на стайню ня прыйшоў не адзін змулены ці падбіты конь. Калі бывае мае ўгаворы ня дзейнічаюць і каторы калгаснік дрэнна адносіцца да каня, я адразу іду ў праўленьне. І з такім калгаснікам мы ня цацкаемся.

Кожны дзень калгаснік чысьціць свайго каня, а многія нават прыходзяць раніцой і ўвечары паглядзець, як я даглядаю коней, ці своячасова кармлю, паю, падсьцілаю.

Я іх правяраю, а яны правяраюць мяне. Так разам і гартуем моц нашага каня. Рыхтуем яго да сяўбы.

Мой рабочы дзень пачынаецца рана. Устаю ў 3 гадзіны раніцы. Да 5-6 гадзін у мяне ўжо коні накормлены, напоены і даглядзены. У мяне няма ніякіх іншых клопатаў, як берагчы каня. Усім я забясьпечан. Хлеба ў мяне хапае, бульбы атрымаў столькі, што ўжо трохі прадаў дзяржаве і яшчэ думаю прадаць. Шмат было гародніны, так што адных гуркоў на 300 руб. прадаў на рынку. Маю сьвіней, карову, завёў гусей і качак. Дзесь памяж справай іх даглядаюць—усё карысьць у гаспадарцы.

РАГАЧОЎСКІ раён.

А. ДЖЭЛЮК

Вышэй сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму

Супроць дэклярацыйнасьці

Я году ў год у Віцебску перапісваюцца рэзалюцыі аб узмацненьні барацьбы за практычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Але далей гэтага справа ня ідзе.

Опудзеньскі пленум гаркому і гарКК ВКП перапісаў указаньне ЦК аб тым, што «на палітычных уроках змаганьня КП(б)Б з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам ня выпадзе... недаацэнільна дрэннае становішча ў прапаганды беларусізацыі, перапучка барацьбы з праўленьнем вялікадзяржаўнага шавінізму, беларусізацыя як неадлучная частка ленінскай нацыянальнай палітыкі ня ўлічана на прынцыповую палітычную вышыню, гэта выдзяляецца самым глыбокім прарывам у рабоце Віцебскай партарганізацыі» (з пастановы Цэнтральнага камітету КП(б)Б 1931 г. па дакладу Віцебскай партарганізацыі).

Пленум гаркому яшчэ раз падкрэсьліў, «што гэтыя бальшавіцкія ўказаньні поўнасьцю захоўваць свае сілу і вагу» (з пастановы аб'яднанага бюро ГК і ГКК КП(б)Б).

І так яшчэ адно прызнаньне, што ў Віцебску нічога ня зроблена для рэалізацыі пастановы ЦК КП(б)Б. Чым-жа пытлумачыць, што Віцебская партарганізацыя не разгарнула сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі?

Асноўнай і рашаючай прычынай такога становішча трэба лічыць адсутнасьць канкрэтнай апэрацыйнай работы па штодзённым ажыцьцяўленьні вынікоўных задач ленінскай нацпалітыкі, вынікаюць мэтанкіраванае не праваляньне, адрыў нацыянальнай ад агульных задач барацьбы за будаўніцтва сацыялізму. Практычная работа пасьвяцілася галоўнай дэклярацыйнасьцю, агульнымі фразамі. Агульнасьць у пастаноўцы гэтых пытаньняў прыводзіла да таго, што на прадпрыемствах часта на ведалі, як канкрэтна праламляць гэтыя ўказаньні і ў большасьці выпадкаў таксама абмяжоўваліся агульнымі дакладамі, агульнымі рэзалюцыямі.

Можна прывесьці цэлы рад фактаў, якія сьведчаць аб тым, што на працягу 1932 году парт'ячэйкі буйнейшых прадпрыемстваў не займаліся пытаньнямі нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Для прыкладу возьмем партколектыў фабрыкі «Дзьвіна». «За гэты год (г. зн. за 1932 г.) на пасяджэньнях і сходах калектыву і ячэек КП(б)Б па культбудаўніцтве пытаньні зусім не стаялі. Толькі 15 сьнежня 1931 г. у сувязі з антысэміцкай вылазкай аднаго кандыдата партыі Вінакураваў партколектыў займаўся мімаходам пытаньнямі нацпалітыкі» (з матар'ялаў нацкамісіі па абсьледаваньні фабрыкі «Дзьвіна»).

Ня лепш стаіць справа і на заводзе «Чырвоны мэталіст». Там таксама бюро партколектыву і фабком за ўвесь 1932 год ні разу не займаліся пытаньнямі нацпалітыкі. Цікава, што нават тады, калі адзін раз быў пастаўлен даклад аб нацыянальнай палітыцы партыі, з-за непадрыхтаванасьці ён прайшоў вяла, ніхто на дакладу не выступаў і та ім і да сёнешняга дня ня вынесена адпаведнае рашэньне.

Пасьля зусім выразных пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б гарком і гарКК пачалі вялрэшную справу. Яны паранылі правесьці па ўсіх партыйных ячэйках адзіны партыйны дзень, прысьвечаны прапрацоўцы пытаньняў нацыянальнай палітыкі партыі.

Але мала вынесьці рашэньне. Треба яго давесьці да мас, треба дапамагчы ніжэйшы ячэйкам практычна ажыцьцявіць гэтыя пастановы. Гэтага ажраз ня ўлічыла кіраўніцтва. Падрыхтоўка партдня была агідная. Як проба было і чакаць парадзень ня даў належных вынікаў. Займаліся дробязямі, разглядалі пытаньні «ў вогуле», канкрэтна амаль нідзе не гаварылі.

Треба проста сказаць, што нават у значнай частцы актыву няма выразнага разуменьня сутнасьці нацыянальнай палітыкі партыі. Толькі гэтым можна вытлумачыць тое, што з боку асобных кіруючых работнікаў мы мелі за апошні час рад няправільных тлумачэньняў сутнасьці нацыянальнага пытаньня. Толькі гэтым можна вытлумачыць тое, што нават асобныя таварышы з кіраўніцтва не разумеюць усёй палітычнай важнасьці пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб памылках у нацыянальных пытаньнях у КП(б).

У большасьці парт'ячэек і фабзаўкомаў нацыянальныя пытаньні ставіліся толькі тады, калі меліся асобныя шавіністычныя вылазкі. Сыстэматычнай прапаганды ленінскай пастаноўкі нацыянальнага пытаньня па ўсёй сыстэме прафэсыянальнай і партыйнай асьветы ня было. Адсюль зусім зразумела, што пры адсутнасьці сыстэматычнай цытбокай прапрацоўкі сутнасьці нацыянальнай палітыкі партыі быў цэлы рад фактаў няправільнага разуменьня і практычнага ажыцьцяўленьня нацыянальнага пытаньня.

Нацыянальныя пытаньні браліся ў большасьці выпадкаў ізалявана ад агульных задач сацыялістычнага будаўніцтва. На значнай частцы прадпрыемстваў і ва ўстановах кіраўнікі парт'ячэек і прафсаюзаў ня ставілі з усёй бальшавіцкай вострасьцю задач інтэрнацыянальнага выхавань ня мас. Прынцып бальшавіцкага інтэрнацыяналізму не прасякнуў увесь аб'ем работы значнай часткі партыйных ячэек і зачковаў.

Ва многіх месцах у Віцебску забылі пра тое, што «мы працяжнікі нацыянальнай свабоды, нацыянальнай роднасьці, нацыянальнай абасобленасьці... мы міжнародніки, інтэрнацыяналісты» (Ленін).

Пад фальшыва-нацыянальным сьцягам

У апошні час у Віцебскім раёне меў месца цэлы рад фактаў, якія сьведчаць аб актыізацыі разьбітых, але яшчэ недабітых нацыянал-дэмакратычных элементаў. Клясавы вораг, які расьпрадаўся, імкнецца прыцягнуць усё для таго, каб упрытаваць свае контрэвалюцыйныя погляды. Напрыклад, у педагагічным інстытуце выкладчык сэксыялёгіі Якімічэ «тэарытычна» абгрунтоўваў свае тэорыю немагчымасьці пабудовы сацыялізму. Ён «даказваў», што «на падставе вучэньня Рыбо (вядомы буржуазны вучоны рэакцыянер-ідэаліст) псыхалёгія чалавека можа мяняцца толькі праз 6 пакаленьняў. Такім чынам сацыялізм ва ўмовах Беларусі можна пабудаваць толькі праз 300 год».

Няма патрэбы замаўчваць гэту хуліганскую антысавецкую вылазку. Зараз цяжэй і той разумее усю контр-рэвалюцыйную рэакцыйную сутнасьць гэтай «тэорыі» выкрышчанага з розуму, «вышалёга». Але нас дзівіць зусім законнае пытаньне, як магло адарыцца, што гэта рэакцыйная «тэорыя» выкладалася ў савецкай школе.

Толькі прытуплённым клясавай пільнасьці можна вытлумачыць тое, што партыйная арганізацыя інстытуту не дала належнай палітычнай адпаведі аб-наглядзеству выступленьню выкладчыка Якімічэ.

Факты актыізацыі нацыянал-дэмакратычных элементаў мы маем таксама і ў Віцебскім вэтэрынарным камбінаце. У апошні час зьявіўся цэлы рад адкрытых нацыянал-дэмакратычных выказваньняў з боку студэнтаў і асобных навуковых працаўнікоў. Студэнтка 4-га курсу Хроп у сваёй пісьмовай рабоце (да рэчы, выпускной) пісала аб тым, што «найбольш разалюцыйная частка у беларускім народзе аказалася сялянства». Работа канчаецца такім заклікам: «Заварушыся, наш край, пад беларускі рев свае путы, новы песьні спявай».

У тым-жа інстытуце мы мелі адкрытую вылазку з боку студэнта (які прэтэндуе на годнасьць паэта) Верамейчыка.

З боку кіраўніка катэдры мовазнаўства Мазуркевіча таксама быў цэлы рад няправільных, па сутнасьці нацыянал-дэмакратычных установак па пытаньнях беларускай мовы. Так, у адным са сваіх артыкулаў ён пісаў: «Час, калі мы маглі задаволіцца ўжываньнем беларускай мовы ў прыватным жыцьці, час, калі мы ставілі сваёй задачай ўжываньне мовай, час, калі мы імкнуліся вызучаць гісторыю беларускай культуры — прайшоў. Мы абнімі пасённы весьці эмаганьне за чыстату беларускай мовы як у афіцыяльным ужываньні, так і ў прыватным жыцьці». Пры такой пастаноўцы пытаньня зусім зьнікаецца праблема барацьбы за далейшы этап беларусізацыі, як неадлучнай часткі ленінскай нацыянальнай палітыкі. Замест таго, каб скалідэтраваць увагу на пытаньнях барацьбы з рэшткамі нацыянал-дэмакратычных установак у мовазнаўстве, замест барацьбы за бальшавіцкі інтэрнацыяналізм, Мазуркевіч зводзіць усю нацпалітыку партыі да пытаньняў барацьбы за чыстату беларускай мовы. Такім чынам ён адрывае форму ад зьместу.

Такое-ж становішча і ў кіно-тэхнікуме. Яркім доказам гэтага зьяўляецца «пазма» студэнта Жэромскага, наскрозь контр-рэвалюцыйная.

Жэромскі марыць аб тым, каб перад ім паўстала «Беларусь сялянская з яе хутарамі, пасёлкамі, крыжамі, яе нацыянал-дэмакратычным гербам».

Кіраўніцтва тэхнікуму ня выкрыла ўсёй контр-рэвалюцыйнай сутнасьці гэтага вершу. Больш таго, Жэромскаму пры абгаварэньні яго вершу на агульным сходзе ўдалося перацягнуць на свой бок менш устойлівую частку студэнцтва. Гарком партыі і гарком самасэкту не палічылі гэтага фактам на прынцыповую вышыню, не ўказалі кіраўніцтву на дапушчаныя памылкі ня выкрыці контр-рэвалюцыйнага твору Жэромскага. Толькі ў апошнія дні гарком заняўся гэтай справай.

У мастацкай творчасьці наглядаецца таксама актыізацыя нацыянал-дэмакратычных элементаў. «Зьвязда» ў свой час пісала аб нацыянал-дэмакратычнай вылазцы мастака Мініна. Ён выступіў з рэакцыйнай ідэалізацыяй беларускай буржуазна-памешчыцкай культуры.

Прыпуленьне бальшавіцкай пільнасьці з боку асобных камуністаў і ячэек дайшло да таго, што ў кіно-тэхнікуме, вэтэрынарным дапушчана такіх людзі не заўважылі ўсёй контр-рэвалюцыйнай сутнасьці вылазак Верамейчыка, Жэромскага і г. д., яны не надалі на прынцыпова - палітычную вышыню гэтых пытаньняў, не заваст рылі ўвагі партыйнай арганізацыі на актыізацыі нацыяналістычных элемэнтаў, на барацьбе з імі.

Гарком і гарКК у апошній сваёй пастанове прызнаюць, што «Віцебская партыйная арганізацыя да апошняга часу не арганізавала бальшавіцкай барацьбы за практычнае ажыцьцяўленьне ўказаньняў Цэнтральнага Камітэту. Гэта магло здарыцца таму, што гарКК, гарсавет, ГСПС, РК ЛКСМБ і інш. арганізацыі не зрабілі для слёе сапраўдных бальшавіцкіх выводаў з урокаў нацдэмаўшчыны, прышчэпаўшчыны, разьбітых, але яшчэ недабітых і якія актывізуюцца ў апошні час».

Якуб Шырокі

Конюх калгасу імя Дзяржынскага

Чаму ў мяне моцныя коні

Мяне выбралі дэлегатам на ўсебеларускі зьезд калгаснікаў-ударнікаў. З новага году працую конюхам. Раней быў у паляводчай брыгадзе і вырабіў за мінулы год 430 працадзён.

Ад праўленьня калгасу атрымаў заданьне—падрыхтаваць да вясны кожнага каня. Гэта заданьне я зараз усімі сіламі стараюся выканаць. Калі я прыйшоў на стайню, часткай коні былі зморыныя, худыя. Зараз коні нашы ў добрым стане, усе папразіліся. Змуленых і замораных зусім няма.

Як я гэтага дабіўся?

Па-першае, да кожнага калгасьніка, што працуе ў паляводчай брыгадзе, я прымацаваў пару коней, за якіх ён адказвае. Прычым калгасьнікі папярэджаны, што па гэтых-жа конях яны будуць працаваць і вясной. Гэта мерапрыемства адразу-ж дало свае вынікі. Павысілася зацікаўленасьць да коней. Кожны сочыць, каб яго пара лепш выглядала, стараецца не перагружаць іх. Калгасьнік ведае, што ад сілы каня будзе залежаць яго работа вясной, будзе залежаць яго працадзень. Лепшы конь —больш вырабіш.

Кармленьне коней я арганізаваў наступным чынам. А 3-яй гадзіне раніцы я даю коням сечку і паю іх. Праз гадзіну дабаўляю сена. Тым, якія сёньня ідуць на работу, даю пору аўса. Кожны дзень раніцою чышчу коней шчоткай і скробкай. Чысьціць коней цяпер асабліва треба, бо яны перад вясной ліняюць.

Другі раз кармлю днём і потым ве чарам.

Асаблівую ўвагу я зварачаю на збрую. Да кожнага каня падагнаны хамут і падсядзёлак. Каб коні не замульваліся, я час-ад-часу прасушваю адсырэлую збрую ў хаце.

Без дазволу праўленьня ніхто каня ў мяне не атрымае. На асабістыя разьезды зараз мы коней нікому не даем.

Цяпер некалькі слоў пра мой калгас.

Мінулы год быў пераломным у рабоце калгасу. Урадкай мы зьнялі ня дрэнны. Жыта—11 цэнтн. з га, пшаніцы—10 цэнтн., ячменю — 12 цэнтн. і аўса—9,6 цэнтн. Добры ўрадкай—вынік нашай работы па гаспадарчо - арганізацыйным умацаваньні калгасу.

Адных збожжавых на працадзень у нас прыпадае 4 кгр. 800 грам. На выпрацаваныя маёй сям'ёй 697 працадзён я атрымаў 100 пудоў жыта, 27 пудоў ячменю, 30 пшаніцы і 400 пудоў бульбы. Забясьпечым мы сябе ўсім, чым толькі патрэбна. І дзяржаве прадалі кожны са сваіх рэсурсаў. Я асабіста прадаў 5 пудоў жыта.

Калгас перавыканаў плян загатовак і добра падрыхтаваўся зараз да веснавой сяўбы. Вось чаму ён і атрымаў мандат на ўсебеларускі зьезд калгаснікаў-ударнікаў.

БАБРУЙСКІ раён.

А. М.

Сі-Су-Дзі



Тав. Сі-Су-Дзі—лепшы калгасьнік-ударнік нацыянальнага калгасу Мар кавічы, Віцебскага раёну.

Калгасьнікі арганізацыя выбралі тав. Сі-Су-Дзі сваім дэлегатам на першы раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Віцебшчыны.

Кітайскі нацыянальны калгас арганізаваўся ў 1929 годзе. Тав. Сі-Су-Дзі—член калгасу з першых дзён яго арганізацыі. Зараз тав. Сі-Су-Дзі—брыгадзір паляводчай брыгады.

З вялікай неахвотай Сі-Су-Дзі ўспамінае пра сваё мінулае жыцьцё ў Кітаі:

— Бацькава сям'я налічвала 4 душы. Зямлі быў невялікі кавалак. Быў ён пашчаны і таму можна было засяваць толькі кукурузу. Рыс да ваў урадкай выключна ў ючэнаў (кулакоў), якія захоплівалі ўсю лепшую зямлю. Мы лезьлі не паміралі з голаду, бо кожны год пазычны былі значную частку ўрадкаю аддаваць на падатак.

Зараз Сі-Су-Дзі—перадавы ўдарнік нацыянальнага кітайскага калгасу. Ён выпрацаваў 438 працадзён. Уся яго сям'я забясьпечана неабходнымі прадуктамі ў достатку.

Тав. Сі-Су-Дзі актыўна змагаецца за ўзорнае правядзеньне першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі. Нацыянальны кітайскі калгас сустракае сяўбу ў баявой гатоўнасьці. Насеньне сьпісана і ачышчана. Машыны і с.-г. інвэнтар поўнасьцю адрамантаваны. Палі калгасу ўгноены.

А. З.

У палоне адміністрацыйнага захапленьня

Адсутнасьць глыбокай палітычнай прапрацоўкі пытаньняў нацыянальнай палітыкі партыі прывяла да таго, што ў цэлым радзе выпадкаў пры правядзеньні нацыянальнай палітыкі, на толькі ня справілася са сваімі задачамі, а, наадварот, сваёй бязьдзейнасьцю, механічным падыходам да пытаньняў нацпалітыкі, голым адміністраваньнем перавярнулася аб'ектыўна ў тормаз яе ажыцьцяўленьня.

Пастановай пленуму гарадзкога камітэту партыі нацыянальная камісія была распушчана.

Характэрнай формай для работы раённага окладу нацкамісіі гарсавету зьяўлялася вывазьленьне спатканьняў, зьвяцьне з работы і наогул не займаліся тым, чым треба. Нацкамісія сваёй работай хутчэй нагадзела адміністрацыі на-судовы орган, чым орган, які заклікан кантраляваць, дапамагаць у вырашэньні усіх пытаньняў, зьвязаных з практычным ажыцьцяўленьнем нацпалітыкі.

Для характарыстыкі падамо некалькі насьць масавай работы з кадрамі ня фактаў. Нацкамісія на адным са сваіх пасяджэньняў прапанавала дырэкцыі каапгэхнікуму «навесьці рашучую барацьбу з той часткай студэнцтва, якая ня ўжывае беларускай мовы ў быце, праводзячы сярод яго масавую растлумачальную працу. Наўжываньне беларускай мовы расцэньваць, як праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму з усімі адсюль вынікамі». Карыстаючыся такім пашпартам (да рэчы, не алзічным), на месцах пачалі нашыльваць ярлыкі, зьнімаць з работы, аддаваць пад суд усіх тых, хто ня ўжывае беларускай мовы, незалежна ад прычын, умоў і г. д.

Рабочы брыгадзір акупярнай фабрыкі Шумкоў выклікаў на сапсталбарніцтва другую брыгаду. Сапдагавор ён напісаў на расійскай мове. Між іншым ён прасіў сакратара рабочкому перакласьці яго на беларускую мову. Адрасуе-ж заўкомам, партыйнай ячэйкай гэты факт быў кваліфікаваны, як наглая вылазка вялікадзяржаўнага шавініста. Шумкоў быў выключан з партыі, прафсаюзу і нават пастаўлена пытаньне аб зьнятьні з работы і аддачы пад суд.

«Зьвязда» гэта раней пісала аб тым, што гарком партыі кваліфікаваў злоўтыньню гэтых пытаньняў, не заваст рылі ўвагі партыйнай арганізацыі на актыізацыі нацыяналістычных элемэнтаў, на барацьбе з імі.

Гарком і гарКК у апошній сваёй пастанове прызнаюць, што «Віцебская партыйная арганізацыя да апошняга часу не арганізавала бальшавіцкай барацьбы за практычнае ажыцьцяўленьне ўказаньняў Цэнтральнага Камітэту. Гэта магло здарыцца таму, што гарКК, гарсавет, ГСПС, РК ЛКСМБ і інш. арганізацыі не зрабілі для слёе сапраўдных бальшавіцкіх выводаў з урокаў нацдэмаўшчыны, прышчэпаўшчыны, разьбітых, але яшчэ недабітых і якія актывізуюцца ў апошні час».

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ТРЫБУНА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

ДЭЛЕГАТЫ АБ СВАЁЙ РАБОЦЕ

Тав. М. П. МАРТЫНАВА калгасьніца с.-г. арцелі імя Сталіна. Дэлегатка Ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

М. П. Мартынава

Ударніца калгасу імя Сталіна

Ведай даручаную справу

Не хацела я ісьці ў калгас. Шмат талі з моіх бакоў—з голаду досыць памёрлі. Няпісьменная была, верыла ўсяму. Кожная мяці шкадуе свайго дзіцяці. За сябе не палохалася—галоўнае баялася за дзяцей.

Цяпер як успомню, што я тады рабіла—сорам бяро. Мой муж пярэ зан. Ён быў у той час старшынёй сельсавету. Доўга мяне ўпрашаў—я не паддавалася. Тады ён узяў і прадаў хату, у якой мы жылі—думаў, бяз хаты нідзе ня дзенешся, пойдзеш у калгас.

А я цэлымі днямі была, палкамі, цэглай, што было пад рукамі,—кідала ў мужа. Але нічога ня зробіш, прыйшлося перасяхаць у калгас.

Першы год на работу амаль не хадзіла. Думаю, навошта нямавецкама на каго працаваць! Якая карысьць? Працуй ці не працуй, прападзе работа марна.

Скажу, нічога ня тоўны, калі бывала ў калгасе трапіца якія нагады: згніе што, ці згніе, ці сварка якая ўзьнікне—мне хоцьбы што. Бо, думаю, зноў дайду на сваю гаспадарку.

Але не, трымаецца калгас! Яго і так, і гэтак працуюць разбурыць—жыве! А мужык не адступае ад мяне:

— Мар'я, на работу трэба ісьці! Мар'я кінь кулакоў слухаць!..

Угаварыў, пайшла на работу. Ідзеш, бывала, па вуліцы, а на цябе шыпяць:

— Дурніца, куды ты ідзеш, чаго табе трэба, чаго слухаеш мужыка свайго, вар'ята!...

Між тым прыйшоў канец году, разь меркавай ўраджай. Атрымалі мы з мукам і грошай, і хлеба, і бульбы, і гародніны. А сьвінчо ды карова ў нас свае. Да новага ўраджаю дажылі, а хлеба ў нас яшчэ нават заста лося. На рынак вазілі прадаваць. А гэта-ж у маім жыцьці першы раз! Першы раз я на рынку прадавала хлеб!

Тады толькі я і зразумела, што можа даць калгаз сялянину. Соромна было перад мужам, перад калгасьнікамі за сваю ранейшаю цемнату.

Але нічога! Выкінулі мы кулакоў, якія прымайстраваліся ў наш калгас і на кожным кроку імкнуліся разбурыць гаспадарку. Выкінулі дзяка, што быў пралез да нас у кладаўшчыкі. Інакш пашла справа.

Зараз мы заканчваем падрыхтоўку да вясны. Усю вывезьлі гной, упчаенае, поўнасьцю адрамантавалі інвэнтар, сэкналі і ачысьцілі насеньне. Коні ў нас спраўныя. Усе людзі разьбіты на брыгады, кожны ведае сваю справу, ведае, што яму і як рабіць, за што ён адказвае.

Дужа добра зрабіла ўлада і партыя, што заклікала калгасьнікаў лік ківаць абязьлічку. У нашым калгасе яе ўжо даўно няма. Кожны з калгасьнікаў да калгаснага дабра адносіцца як да свайго роднага, уласнага, бо ведае: чым лепш беражеш калгаснае дабро, чым лепш працуеш, тым больш будзеш мець.

Я даглядаю цялят. Зараз іх у мяне 12. Апрача гэтага кароў даю. Я гляджу, каб кожная карова ў мяне начыста была выдаена, каб і каліва не засталося малака, каб не патрэскаліся саскі.

Я і ўночы ўстану, да цялят пайду—даглядзку ці ня холадна ім, можа трэба каторага з іх падпаіць.

Калі мяне выбралі на раённы зьлёт калгасьнікаў, я на ноч вярнулася да мову. Там мне і пасьцель далі і вячэру—а я не, кажу, паеду ў калгас. Чаго, пытаюць, цябе пакінае за блізкі сьвет? А як-жа мае цялята? Ці напояць іх там, ці даглядзяць, як трэба, ці дадуць належную норму? Паехала, напаіла цялят, перапачавала, а раніцой, зноў даглядзеўшы, паехала на зьлёт.

Зараз мяне выбралі на зьезд калгасьнікаў у Менск. Прасілася, каб не выбралі. Бо няма мне на каго ассабліва даручыць цялят. Усе заняты сваёй работай. Але выбралі, трэба ехаць. Я ўсе гэтыя дні буду рыхтаваць аднну з даглядчыц—як даглядаць цялят, як іх паіць і карміць.

ВЕДАЙ ДАРУЧАНУЮ СПРАВУ—вось што важна.

А на зьезьзе я раскажу пра сваю работу, пра калгас, пра тое, як ён зрабіўся адным з лепшых. Раскажу, як я з апошняй бяднячкі стала заможнай калгасьніцай.

Пры разьмеркаваньні ўраджаю ў мінулым годзе мы з мужам (ён загад вае фермай) за 950 працадзён, якія мы выпрацавалі, атрымалі 84 пуды жыта, 21 пуд гароху, 35 пудоў ячменю, 18 пудоў бручкі, 35 пудоў капусты, 600 пудоў бульбы і 700 руб. грашыма. Апрача гэтага мы мелі свой гарод, ад якога таксама атрымалі добрыя прыбытні. Малака хапае ў нас, у хаце ёсьць заўсёды скварка, бо трымаем сьвіней. Ну, а пра хлеб і гаварыць ня прыходзіцца.

Калі жылі на сваёй гаспадарцы, дык і за тры гады столькі не атрымлівалі, як атрымалі ў калгасе за адзін год. Усе сыты, апранутыя, абутыя. Ні ў чым ня маем нехватак.

Сёньня вось крыху хворая—прастудзілася. Калгасьнікі пасылаюць—едзь да доктара. А я кажу—пройдзе. Некалі зараз хварэць. Вясна на насу. Працаваць трэба, кажу я ім і сьмяюся.

І сапраўды, колькі напередзе яшчэ працы!

РАГАЧОЎСКІ раён.

В. Гімельштэйн

Старшыня калгасу „Сацыялізм,'

ВЯСНА ПАЧАЛАСЯ З ВОСЕНІ

Я выбрана дэлегатам усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. Наш калгас інтэрнацыянальны і яднае 77 беларускіх, яўрэйскіх, украінскіх і нямецкіх гаспадарак.

— Хочаш атрымаць высокі ўраджай, рыхтуйся да вясны яшчэ з восені.

Так мы паставілі пытаньне на калгасным сходзе. І сапраўды наш калгас падрыхтоўку да пасеўнай пачаў у кастрычніку мінулага году.

Каваль КУХМАН МІКОЛА першы абязьсьцідзіў сябе ўдарнікам. Ён ня сенчыў, што няма жалеза, як гэта робяць у некаторых калгасах. Замест гэтага, Кухман уважліва глядзеў сабе пад ногі. Літаральна з-пад ног, са сьмецьця, з розных кучкоў ён назьбіраў старага жалеза, якое было скары стапа для рамонту інвэнтара.

Так пачалося спаборніцтва паміж брыгадамі—хто хутчэй і лепш скончыць рамонт. Першай скончыла Ісаеўская брыгада, бо там сапраўды пазударному працаваў Кухман. Увесь інвэнтар калгасу: дыскавая сяўярка, 15 спружынных боран, 45 плугоў, 48 калёс і 80 хамутоў прывезены ў поўную гатоўнасьць. Адрамантаваны інвэнтар тут-жа пранумаравалі і прымацавалі да кожнай брыгады, а ў брыгадзе—да кожнага калгасьніка.

Не драмаў і наш старэйшы конюх Скарабагаты Пятро. Калі ня прыдзеш на стайню, ці днём ці ноччу, ён заўсёды там, як быццам з зямлі вырастае. Абязьлічка ў рабоце на конях у нас ліквідавана ўжо даўно. Пятро пільна сачыў за калгасным канём, каб раз заведзены парадак не парушаўся. Коні заўсёды былі свачасова напоены, накормлены і вычышчаны. Дый калгасьнікам ён ня спушчаў. Як толькі заўважыць, што хтонебудзь з канём дрэнна абыходзіцца, адразу-ж на праўленьні пытаньне ста віць, або на некалькі дзён каня адбірае. Слова конюха Пятра стала законам. Да яго прыслухоўваюцца і брыгадзіры, і калгасьнікі. Зразумела, праўленьне ва ўсім яго падтрымлівала. І вось з 66 рабочых коняй—20 вышэй сярэдняй сытасьці, рэшта — сярэдняй. На час палявых работ забраніваны фуражны фонд: 900 пуд. аўса, 1.500 пуд. канюшыны, 1.000 пуд. сена.

Толькі добраякаснае насеньне і ўгноеная глеба даюць сапраўды добры ўраджай. У гэтым мы пераканаліся яшчэ летась. Дамкуючы добрай апрацоўцы глебы мы дабіліся ўраджаю па збожжавых 7,6 цэнтн. з га, замест 4,5 цэнтн. у 1931 годзе. Гэтыя лічбы ўрэзаліся ў памяць кожнага калгасьніка. Бо калі ў 1931 годзе на працадзень прыпадала збожжавых 870 грам, дык у 1932 —3 кг. 100 грам. А ўсё таму, што лепш узоравалі, добра баранавалі і як сьлед угнойвалі.

Таму ўжо зараз мы перавезьлі 45 тон мінэральнага ўгнаеньня, вывезьлі на поле 600 пуд. гною і сабралі 3 тоны попелу.

Насеньне мы ссыпалі з ліхвой. Яно добра ачышчана і адсартавана. Так, пшаніцы замест 17,6 цэнтн. мы ссыпалі 18, аўса замест 154—164, ячменю замест 27,2—29,7 цэнтн., бульбы—1584 цэнтн. Лішкі насеньня мы абменьваем іншым калгасам—канюшыны 40 пуд., гароху 50 пуд. і вікі 60 пуд.

Зразумела, гэта нам далося ня лёгка. І ў наш калгас былі пралезьлі кулакі і падкулачнікі, якія прабавалі разбурыць гаспадарку. Вось, напрыклад, Віхоўскі М. Калісьці ён быў панскім лясьнічым і эксплёатаваў батракоў. У самы разгар падрыхтоўкі да сяўбы, калі мы пераглядзілі і прымілі новыя нормы выпрацоўкі, Віхоўскі пачаў падбухторваць калгасьнікаў, каб яны ня выходзілі на работу. Усім, хто падаваў заяву ў калгас, ён казаў: «Ня ідзеце, я сам думаю выходзіць з калгасу. Пры гэткіх нормах колькі ні працуй—нічога ня зробіш, калгас разваліцца».

Зразумела, калгасьнікі выпыблі яго вон з калгасу.

А вось і другі—Сьцежка Ахрэм. Да рэвалюцыі ён эксплёатаваў батракоў. У 1931 годзе, будучы брыгадзірам, наўмысьля згніў 3.000 пуд. насеннай бульбы. У мінулым годзе хацеў разьмеркаваць калгасную сенажаць усім па кавалку. Калі былі выкінуты з калгасу кулакі Віхоўскі і Прановіч, ён выступіў у абарону іх. Але дарэмна. Яму хутка паказалі на дзьверы.

Зараз замест выпыбленых кулакоў да нас з ахвотай ідуць добрасумленныя аднасобнікі. У праўленьне падана ўжо 30 заяў.

Скажу яшчэ коратка пра малочную калгасную ферму. Гэта гонар калгасу. За год колькасьць кароў павялічылася са 183 да 262. Гадуецца і 45 пітук маладнякa.

Наш калгас першым у раёне выканаў дзяржаўнае загатоўкі, а зараз першым падрыхтаваўся да сяўбы.

СТАРАДАРОСКІ раён.

ЫВАЗКА ГНОЮ Ў КАЛГАСЕ ІМЯ КАЛІНІНА.

І. Р. Завацкі

Брыгадзір-палявод калгасу імя Калініна

Мая брыгада

У маёй брыгадзе 48 чалавек. Рабочых коняй—21. Брыгада павінна засеяць бульбы 54 га, аўса—33, ячменю—16, вікі—11, грэчкі—10, ільну—10 і гароху—5 га. Усяго брыгада павінна засеяць 161 гэктар.

Брыгада мая падабрана з добрых і сумленных калгасьнікаў. Усе яны працуюць у калгасе ўжо ня першы год. Многія з іх у калгасе па 5—6 год, а то і болей. Зараз брыгада закапчвае вывазку гною. Угнаеньне ўжо падвезена. Насеньне мы поўнасьцю атрымалі ад калгасу. Ачысьцілі яго і адсартавалі. Яно знаходзіцца ў сьвірне і ахоўваецца вартаўнікамі. Увесь інвэнтар—плугі, бораны звычайныя, дыскавыя, сяўяркі, хамуты, пастромкі—адрамантаваны.

Назапашана патрэбная колькасьць тэрэвак. Прывезены ў парадак усе калёсы. Адрамантаваны 4 лішнія нарты. Кавалі рамантуюць уборачны інвэнтар—жнівяркі, касілкі і г. д.

Кожны калгасьнік мае прымацаванага да яго каня, вупраж, інвэнтар. План сяўбы мы даскапала прапрацавалі на брыгадзе. Устанавілі тэрміны звышпрадукцыйнай сяўбы.

Ёсьць усе падставы для таго, каб заявіць, што наша брыгада цалкам падрыхтавана да выхаду ў поле.

РАГАЧОЎСКІ раён.

На хвалях самацёку

Партарганізацыя не ўзначаліла барацьбы з праўленьнем шавінізму іншых нацыянальнасьцяй.

Клясавы вораг, карыстаючыся слабай палітычнай пільнасьцю камуністаў, якія працуюць на гэтым участку, імкнецца працяпіцуць пад фальшыва-нацыянальным сьцягам сваё буржуазна-нацыяналістычныя погляды.

За апошні час мы мелі цэлы рад выступленьняў нацыяналістычных элемэнтаў у шматтыражках на віцебскіх прадпрыемствах. У шматтыражцы фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», якая выходзіць на яўрэйскай мове, надрукован артыкул пад назвай «Яўрэі, што вы сьпіце». У шматтыражцы акцыянэрнай фабрыкі быў зьмешчан артыкул, які сеяў нацыянальную варожасьць сярод беларускай і яўрэйскай часткі рабочых.

У яўрэйскай бібліятэцы выкрыта вялікая засьмечанасьць клясава-варожай літаратурай. Там да гэтага часу сярод іншых кніг можна знайсьці праграмы сіяністаў, сіяністкія журналы і інш. Творы такога буржуазнага сіяністкага аўтара, як Жыбоўскі, знаходзілі сабе месца на палічках бібліятэкі побач з выдатнейшымі творамі савецка-марксыцкай літаратуры.

Мы ўжо не гаворым аб тым, што ў гэтай бібліятэцы знаходзяць сабе прытулак і распаўсюджваньне бібліі і іншы рэлігійных хлам. Прыкладна такое-ж становішча і ў польскай бібліятэцы. Там раздаваліся дзецям евангельлі і розныя іншыя рэлігійныя кнігі. Больш таго, у бібліятэцы выкрыты кнігі, якія прывезены з-за мяжы. Пры гэтым кнігі, якія завозіліся антысавецкімі элемэнтамі, проста прышчапляліся дзецям ідэя барацьбы за вялікую Польшчу «ад мора да мора». Клясава-варожыя элементы, якія пралезьлі ў бібліятэкі бібліятэкі, сыстэматычна давалі дзецям для чытаньня антысавецкую літаратуру.

У латыскім клюбе буржуазна-нацыяналістычныя элементы, таксама знайшлі сабе прытулак. Яны разгарнулі там вялікую антысавецкую работу.

Над пытаньнямі праблемы кадраў ні наркамісія, ні гарсавет не працавалі. Праблема кадраў для работы сярод нацыянальнасьцяй набывае выключна вялікае значэньне. Кадры нацыянальных школ у значнай частцы засьмечаны клясава-варожымі элементамі. У асобных выпадках клясава-варожыя элементы, прыкрываючыся нацыянальнымі асобнасьцямі работы, знаходзілі сабе прытулак у школах, клюбах і г. д.

Зусім нярадкія выпадкі, калі ў сьпісах настаўнікаў нацыянальных школ сустракаліся прозьвішчы дзячок дваран, памешчыкаў, буйных гандляроў, раскулачаных і высланых кулакоў і г. д.

Настаўніца адной з польскіх школ, дачка былога дваранина—памешчыка Доўпар-Запольская займалася антысавецкай работай. Справа даходзіла да таго, што ў гэтай школе ў дзяцей знаходзілі польскія нацыяналістычныя значкі.

Нацкамісія, гарграфсавет, гарКК глы бока не надавалі ўвагі ні апошні год станоўчым работы школ нацыянальных меншасьцяй. Калі і выносіліся рашэньні, дык яны ў большасьці выпадкаў на сілі аўтоны характар. Такая сыстэма кіраўніцтва нацыянальнымі школамі прыняла да таго, што за апошні час ёсьць рад скаляваньняў ня толькі ў мэтадах выкладаньня, але і ў прынцыпах будаўніцтва савецкай нацыянальнай школы. Напрыклад, у Палеўскай школе, Віцебскага раёну, ёсьць дзьве групы—беларуская і польская. Беларуская група забясьпечана добрымі кадрамі настаўнікаў. Польская-ж на мае настаўніцкага складу. У выніку ад сутнасьці дапамогі польскай групе атрымалася тое, што выкладаньне дысцыплін ідзе выключна на беларускай мове, польская-ж мова ўвагнана толькі як прадмет. Дайшла справа да таго, што ніякай розьніцы паміж беларускай і польскай групай у мэтадзе і сыстэме выкладаньня ня было.

Яшчэ горшае становішча з падручнікамі. Тут клясавы вораг, карыстаючыся палітычнай тушасьцю асобных камуністаў—кіраўнікоў школ, карыстаючыся труднасьцямі ў заваёўнні гэтых падручнікаў разгарнуў вялікую школьніцкую работу. Для прыкладу возьмем такі факт: у латыскіх школах значная частка падручнікаў і на сёньняшні дзень увозіцца з-за мяжы. Ёсьць выпадкі ўвозу падручнікаў з-за мяжы і на літоўскай мове. Карыстаючыся тым, што значная частка падручнікаў прыходзіць у школы без алтаваднага кантролю, розныя антысавецкія арганізацыі давалі ў ёсьць падручнікаў самы адкрыты буржуазны хлам.

Трэба проста сказаць, што ні Наркамасьветы, ні ДВВ не паклапаціліся і не правялі належнай палітычнай пільнасьці і апэрацыйнасьці ў тым, каб забясьпечыць школы нацыянальных меншасьцяй сталым партыйна-вытрыманым савецкім падручнікам.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне ў школах і клюбах пастаўлена надзвычай дрэнна. Буржуазна-нацыяналістычныя элементы, якія пралезьлі ў кіраўніцтва школамі нацменшасьцяй, імкнуцца скарыстаць савецкія школы для распальваньня нацыянальнай варожасьці сярод дзетвары. Гарадзкі аддзел нарасьветы не прапрабаваў ні разу склікаць настаўнікаў школ нацменшасьцяй і пастаўць ня ўсю шырыню праблему інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі ў большасьці выпадкаў недаацэнілі ўсёй палітычнай важнасьці праблемы барацьбы за бальшэвіцкі інтэрнацыяналізм ва ўсёй сыстэме работы савецкай школы. Мы маем рад фактаў проста анэкдатычнага характару, калі ўсю сутнасьць інтэрнацыянальнай работы ассобныя партыйныя ячэйкі бачаць толькі ў вечарох сяброўкі розных нацыянальнасьцяй. Нацкамісія тарасавету ў якасьці адзінай меры інтэрнацыянальнага выхаваньня прапанаве наладзіць вечары.

Мы зусім ня супроць такіх вечароў. Гэта форма масавай работы на практыцы паказала сваю жыцьцяёвасьць, не бязумоўна трэба будзе правядзіць і ў далейшым. Але мы рашуча выступаем супроць таго, каб усю суму пытаньняў інтэрнацыянальнага выхаваньня зводзіць толькі да такіх культурніцкіх кампанейскіх форм работы. З такога роду настроямі і практыкай трэба весьці самую рашучую і непрымірымую барацьбу. Інтэрнацыянальнае выхаваньне павінна быць пакладзена ў основу ўсёй палітычнай работы на ўсіх галінах.

Рашуча змагацца з вялікадзяржаўным шавінізмам

ЦО УсеКП(б)—«Правда» ў сваім перадавым артыкуле з усёй сілай падкрэсьлівае, што «вялікадзяржаўны ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай у нацыянальным пытаньні нашай партыі, бо ён у сваю чаргу стварае спрыяючую глебу для распальваньня нацыяналістычных пачуцьцяў сярод мас і тым самым узмацняе нацыяналістычных буржуазна-кулацкіх і байскіх элементаў і іх ударнікаў унутры партыі. У выніку гэтага часам ўхіл да мясцовага нацыяналізму набывае на пасобных вузатках і ў пасобных раёнах асаблівую надзвычайнасьць. У гэтым мы ўпэўніваемся зараз на прыкладзе тай-жа Беларусі, а таксама Украіны і ряду іншых нацыянальных рэспублік».

Трэба з усёй рэзкасьцю сказаць, што ў Віцебскай арганізацыі, нават у кіруючым актыве, не зразумелі з усёй глыбінёй гэтых указаньняў. Пасьля лета т. т. Гікало і Гападзала ў «Правде», пасьля артыкулу «Звязды» ў актыве атрымалася нейкая замішанасьць, яўнапаўнасьць і г. д. На асобных прадпрыемствах ёсьць факты простага неразуменьня ўсёй палітычнай сутнасьці пастановы ЦК УсеКП(б).

У вэтэрынарным інстытуце частка нацыяналістычна настроеных элемэнтаў проста заявілае:

— Цяпер беларусізацыя лопнула, будзем пераходзіць на рускую мову.

Вялікадзяржаўныя элементы на чытэчнай вузьле імкнуцца вытлумачыць па-свойму гэту справу. Ёсьць факты простага выступленьня супроць беларусізацыі.

За апошні час былі факты адкрытага сабатажу пры правядзеньні беларусізацыі. Напрыклад, у кіно-тэхнікуме частка студэнтаў, беларускіх дысменьшыкаў, дэманстрацыйна адмовіліся зазнаёміцца за лікі па беларускай мове. Яна-ж адмовілася пісаць і гаварыць па-беларуску і перайшла на расійскую мову.

І ў гэты важны палітычны момант асаблівая неабходна выразнасьць у кіраўніцтве. Такой выразнасьці пакуль што няма. Вялікадзяржаўнікі і нацыяналістычныя элементы не атрымалі знішчальнага ўдару. Кіраўніцтва не прыняло мер, каб глыбока прапрацаваць у масах большасьцяй рашэньні па нацыянальным пытаньні.

Становішча з беларусізацыяй надзвычай цяжкае. У гэтым пытаньні ёсьць цэлы рад ненармальных тлумачэньняў з боку асобных работнікаў. Некаторыя таварышы і да апошняга часу не зразумелі ўказаньняў тав. Сталіна аб тым, што «нацыянальнае пытаньне ёсьць частка агульнага пытаньня аб пралетарскай рэвалюцыі, аб дыктатуры пралетарыяту». Вось імённа значная сума гэтых пытаньняў не бярэцца ў сувязі з агульнай пастановай задач сацыялістычнага будаўніцтва. Замест гэтага ў неадпаўных рашэньнях нацкамісіі мы сустракаемся з простымі ўказаньнямі на тое, што ўсе ці цынальная палітыка партыі павінна зьвесьціся да беларусізацыі. Прычым сама беларусізацыя бярэцца ізалявана, адарвана ад агульнай сумы мерапрыемстваў, якія праводзяцца партыяй.

З такога роду скаляваньнямі нацыянальнай палітыкі партыі трэба павесьці бязьлітасную барацьбу. Усямерна змагаючыся з мэханіцным правядзеньнем нацыянальнай палітыкі, трэба з усёй рэзкасьцю паставіць пытаньне далейшай беларусізацыі ў Віцебскім раёне. Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па вялікадзяржаўных, шавіністычных, чынгоўніцкіх элементах, якія сабатуюць правядзеньне беларусізацыі. Аб тым, што ў гэтых пытаньнях у Віцебску ёсьць глыбокі прагрэс, сьведчаць такія факты.

У Віцебску яшчэ не зразумелі, што барацьба за далейшае правядзеньне беларусізацыі ня зьнімаецца з парадку дня. Не зразумелі і таго, што ленінская нацыянальная палітыка знаходзіцца на ўмацаваньне інтэрнацыянальнага выхаваньня, на будаўніцтва нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу культуры. Толькі ў шматлікую большавіцкую інтэрнацыянальную палітыку ёсьць глыбокая змагаючая работа сярод шырокіх працоўных мас.

Віцебская партарганізацыя павінна прыняць усе меры да таго, каб ліквідаваць гэты ганебны прарыў. Гэтая партарганізацыя можа дабіцца толькі ў рашучай і непрымірымай барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам—галоўнай небясьпекай у умовах ідэйнага ўдару на мясцовым беларускім нацыянальным, які зараз набывае асаблівую вострасьць.

кол БДТ-2, як праўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму. Фракцыя гарграфсавету пашла яшчэ далей. Яна дайшла да таго, што безапэляцыйна залічае ў разрад вялікадзяржаўных шавіністаў усіх тых, хто ня прымае рашучых мер да арганізацыі рабочага гледача і нават прапануе аддаваць іх пад суд. Так, у пастанове фракцыі гарграфсавету ад 20 студзеня 1933 году записана, што «акцыянэрная фабрыка, саюз працаўсьветы, гарбарня, інструментальна - мэблевая фабрыка, песазавод ім «Правды» не вядуць работы па арганізацыі гледача акол БДТ-2 і што гэта ёсьць праўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму. Фракцыя катэгарычна папярэджвае старшынь ФЗМК, што ў выпадку няпрыняцця рашучых мер па арганізацыі рабочага гледача паўстане пытаньне аб прыцягненьні іх да судовай, партыйнай і прафсаюзнай адказнасьці.

Гэта рашэньне і да сёньняшні дзень не скасавана. Прафбюракраты з партыйнымі білетамі ў кішэні хоцуць захаваць сваю злачынную бязьдзейнасьць у пытаньнях нацыянальнай палітыкі партыі і наогул у культурнамасавай рабоце за гэтымі бюрыдуднымі антыпартыйнымі рашэньнямі.

Сыстэма адміністрацыйных метадаў работы захапіла ня толькі савецкія, але і прафсаюзныя арганізацыі. На працягу апошняга году гарграфсавет ад рача бюракратычнай пісаніны не займаўся пытаньнямі нацыянальна - культурнага будаўніцтва. Характэрным узорам самазрашчэньня, безадказных адносін да адказнасьцяўленьня нацыянальнай палітыкі з боку прафесыянальных арганізацый можа служыць хець-бы тое, што іх пастановы прасякнуты наскрозь вахлымі бюрэратычнымі адносінамі. Напрыклад, у постанове фракцыі гарграфсавету ад 28 студзеня па пытаньні аб скліканьні агульна-гарадзкога зьлёту нацменшасьцяй дасіца такая ўстаноўка нізавым прафзьвеньням. Фракцыя прапануе правесьці гэты зьлёт пад знакам таго, каб «дабіцца дасягнення ўніку нацыянальнага складу прадпрыемстваў». Хіба-ж можна зьвесьці ўсё пытаньне нацыянальнай палітыкі партыі да ўліку нацыянальнага складу прадпрыемстваў.

За ўвесь год гарграфсавет ні разу не папрабаваў скліканьць прафактыў, на якім-бы абгаварыў асноўныя пытаньні нацыянальнай палітыкі партыі.

Аб пакаёўным пальхоцзе да культурна-масавай работы, да папулярызацыі ленінскай нацыянальнай сьведчыць такі факт, што гарграфсавет адпусьціў на куплю беларускай літаратуры і літаратуры нацменшасьцяй на 1932 год для буйнейшых рабочых клюбаў зусім мізэрныя сродкі. Так, па клюбе шпейлікаў, які абслугоўвае звыш 8.000 рабочых, адпушчана 368 руб. на літаратуру. Па клюбе мэталістаў, які абслугоўвае звыш 3.000 рабочых, адпушчана 299 руб. Пры такіх сумах нават самых неабходных кніг набыць нельга. Зусім ня дзіва, што ў рабочых клюбах амаль няма навінак беларускай і нацменаўскай пралетарскай літаратуры.

Трэба проста сказаць, што гарграфсавет і нацкамісія не ўзначаліла работы па нацыянальнай палітыцы партыі. Яны фактычна цягнуліся ў хвасьце падзей. У лепшым выпадку яны зьдзяйсьлялі пасыўныя рэгістратарамі фактаў, у горшым яны перапаралася ў органы, якія, замест шырокай растлумачальнай работы, займаліся адміністрацыйнымі перагібамі, мэханічным прадзяньнем нацпалітыкі, груба парушаючы дырэктывы партыі.

ГарКК-РСІ сваімі пасыўнымі адносінамі фактычна пагнябляла гэты прарыў, які вызначыўся ў Віцебскай партарганізацыі пры правядзеньні нацпалітыкі партыі. Нават і зараз гарКК не ўзяла на прынцыповую палітычную вышыню справу Шумкова і інш., яна не папрабавала прапрацаваць ня ў масах, вскрыць усю шкодасьць мэханічнага правядзеньня нацыянальнага пытаньня.

На хвалях самацёку

Партарганізацыя не ўзначаліла барацьбы з праўленьнем шавінізму іншых нацыянальнасьцяй.

Клясавы вораг, карыстаючыся слабай палітычнай пільнасьцю камуністаў, якія працуюць на гэтым участку, імкнецца працяпіцуць пад фальшыва-нацыянальным сьцягам сваё буржуазна-нацыяналістычныя погляды.

За апошні час мы мелі цэлы рад выступленьняў нацыяналістычных элемэнтаў у шматтыражках на віцебскіх прадпрыемствах. У шматтыражцы фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», якая выходзіць на яўрэйскай мове, надрукован артыкул пад назвай «Яўрэі, што вы сьпіце». У шматтыражцы акцыянэрнай фабрыкі быў зьмешчан артыкул, які сеяў нацыянальную варожасьць сярод беларускай і яўрэйскай часткі рабочых.

У яўрэйскай бібліятэцы выкрыта вялікая засьмечанасьць клясава-варожай літаратурай. Там да гэтага часу сярод іншых кніг можна знайсьці праграмы сіяністаў, сіяністкія журналы і інш. Творы такога буржуазнага сіяністкага аўтара, як Жыбоўскі, знаходзілі сабе месца на палічках бібліятэкі побач з выдатнейшымі творамі савецка-марксыцкай літаратуры.

Мы ўжо не гаворым аб тым, што ў гэтай бібліятэцы знаходзяць сабе прытулак і распаўсюджваньне бібліі і іншы рэлігійных хлам. Прыкладна такое-ж становішча і ў польскай бібліятэцы. Там раздаваліся дзецям евангельлі і розныя іншыя рэлігійныя кнігі. Больш таго, у бібліятэцы выкрыты кнігі, якія прывезены з-за мяжы. Пры гэтым кнігі, якія завозіліся антысавецкімі элемэнтамі, проста прышчапляліся дзецям ідэя барацьбы за вялікую Польшчу «ад мора да мора». Клясава-варожыя элементы, якія пралезьлі ў бібліятэкі бібліятэкі, сыстэматычна давалі дзецям для чытаньня антысавецкую літаратуру.

У латыскім клюбе буржуазна-нацыяналістычныя элементы, таксама знайшлі сабе прытулак. Яны разгарнулі там вялікую антысавецкую работу.

Над пытаньнямі праблемы кадраў ні наркамісія, ні гарсавет не працавалі. Праблема кадраў для работы сярод нацменшасьцяй набывае выключна вялікае значэньне. Кадры нацыянальных школ у значнай частцы засьмечаны клясава-варожымі элементамі. У асобных выпадках клясава-варожыя элементы, прыкрываючыся нацыянальнымі асобнасьцямі работы, знаходзілі сабе прытулак у школах, клюбах і г. д.

Зусім нярадкія выпадкі, калі ў сьпісах настаўнікаў нацыянальных школ сустракаліся прозьвішчы дзячок дваран, памешчыкаў, буйных гандляроў, раскулачаных і высланых кулакоў і г. д.

Настаўніца адной з польскіх школ, дачка былога дваранина—памешчыка Доўпар-Запольская займалася антысавецкай работай. Справа даходзіла да таго, што ў гэтай школе ў дзяцей знаходзілі польскія нацыяналістычныя значкі.

Нацкамісія, гарграфсавет, гарКК глы бока не надавалі ўвагі ні апошні год станоўчым работы школ нацыянальных меншасьцяй. Калі і выносіліся рашэньні, дык яны ў большасьці выпадкаў на сілі аўтоны характар. Такая сыстэма кіраўніцтва нацыянальнымі школамі прыняла да таго, што за апошні час ёсьць рад скаляваньняў ня толькі ў мэтадах выкладаньня, але і ў прынцыпах будаўніцтва савецкай нацыянальнай школы. Напрыклад, у Палеўскай школе, Віцебскага раёну, ёсьць дзьве групы—беларуская і польская. Беларуская група забясьпечана добрымі кадрамі настаўнікаў. Польская-ж на мае настаўніцкага складу. У выніку ад сутнасьці дапамогі польскай групе атрымалася тое, што выкладаньне дысцыплін ідзе выключна на беларускай мове, польская-ж мова ўвагнана толькі як прадмет. Дайшла справа да таго, што ніякай розьніцы паміж беларускай і польскай групай у мэтадзе і сыстэме выкладаньня ня было.

Яшчэ горшае становішча з падручнікамі. Тут клясавы вораг, карыстаючыся палітычнай тушасьцю асобных камуністаў—кіраўнікоў школ, карыстаючыся труднасьцямі ў заваёўнні гэтых падручнікаў разгарнуў вялікую школьніцкую работу. Для прыкладу возьмем такі факт: у латыскіх школах значная частка падручнікаў і на сёньняшні дзень увозіцца з-за мяжы. Ёсьць выпадкі ўвозу падручнікаў з-за мяжы і на літоўскай мове. Карыстаючыся тым, што значная частка падручнікаў праходзіць у школы без алтаваднага кантролю, розныя антысавецкія арганізацыі давалі ў ёсьць падручнікаў самы адкрыты буржуазны хлам.

Трэба проста сказаць, што ні Наркамасьветы, ні ДВВ не паклапаціліся і не правялі належнай палітычнай пільнасьці і апэрацыйнасьці ў тым, каб забясьпечыць школы нацыянальных меншасьцяй сталым партыйна-вытрыманым савецкім падручнікам.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне ў школах і клюбах пастаўлена надзвычай дрэнна. Буржуазна-нацыяналістычныя элементы, якія пралезьлі ў кіраўніцтва школамі нацменшасьцяй, імкнуцца скарыстаць савецкія школы для распальваньня нацыянальнай варожасьці сярод дзетвары. Гарадзкі аддзел нарасьветы не прапрабаваў ні разу склікаць настаўнікаў школ нацменшасьцяй і пастаўць ня ўсю шырыню праблему інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі ў большасьці выпадкаў недаацэнілі ўсёй палітычнай важнасьці праблемы барацьбы за бальшэвіцкі інтэрнацыяналізм ва ўсёй сыстэме работы савецкай школы. Мы маем рад фактаў проста анэкдатычнага характару, калі ўсю сутнасьць інтэрнацыянальнай работы ассобныя партыйныя ячэйкі бачаць толькі ў вечарох сяброўкі рознымі нацыянальнасьцяй. Нацкамісія тарасавету ў якасьці адзінай меры інтэрнацыянальнага выхаваньня прапанаве наладзіць вечары.

Мы зусім ня супроць такіх вечароў. Гэта форма масавай работы на практыцы паказала сваю жыцьцяёвасьць, не бязумоўна трэба будзе праводзіць і ў далейшым. Але мы рашуча выступаем супроць таго, каб усю суму пытаньняў інтэрнацыянальнага выхаваньня зводзіць толькі да такіх культурніцкіх кампанейскіх форм работы. З такога роду настроямі і практыкай трэба весьці самую рашучую і непрымірымую барацьбу. Інтэрнацыянальнае выхаваньне павінна быць пакладзена ў основу ўсёй палітычнай работы на ўсіх галінах.

Рашуча змагацца з вялікадзяржаўным шавінізмам

ЦО УсеКП(б)—«Правда» ў сваім перадавым артыкуле з усёй сілай падкрэсьлівае, што «вялікадзяржаўны ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай у нацыянальным пытаньні нашай партыі, бо ён у сваю чаргу стварае спрыяючую глебу для распальваньня нацыяналістычных пачуцьцяў сярод мас і тым самым узмацняе нацыяналістычных буржуазна-кулацкіх і байскіх элементаў і іх ударнікаў унутры партыі. У выніку гэтага часам ўхіл да мясцовага нацыяналізму набывае на пасобных вузат

У Кармяншчыне няньчацца з ворагамі народу

(Ліст фінработніка)

Калгасам «Памяць Леніна», Кармянскага раёну, «кіруе» Беразоўскі Андрэй, «дапамагае» яму паліводкалгасу Кавалёў Я. Беразоўскі сыстаматычна разам з Кавалёвым, **Вараб'ёвым і Тужыкавым Я. займаюцца папойкамі, а для папоек гэта група раскрадае калгаснае добра, чым вядзе калгас на разбурэньня.**

У мэтах падарваць калгаснае будаўніцтва і ашукаць дзяржаву, Беразоўскі і К° ў часе давядзеньня пляну па бульбазагатоўках заявілі:—«У калгасе ёсьць СТФ, а калі так, то плян быў значна перамешан». **На самойка справе, СТФ у гэтым калгасе няма. Заданьне па ільнавалакне ня выканана, у той час, як 25 тон ільнатрасты згніло на полі.**

Сепажаць калгасу таксама пацярпела ад гэтых шкоднікаў, бо ўборка была праведзена несвая часова, **а тры га** скошанай сепажаці засталося нават пад сьнегам. Ворыва пад зяб зусім не праводзілася. Усе гэтыя злачынствы рабіліся ня гледзячы на наяўнасьць рабсілы і добрага конска га паголоўя.

Гэта шайка шкоднікаў імкнулася разбурыць калгас і, каб выканаць гэты кулацкі заказ, яны давялі калгаснае конскае паголоўе ў ліку 33 коняй да зморанасьці. Рабілася гэта з тай мэтай, каб калгасу ў веснавую сяўбу ня было на чым выехаць у поле.

Калі яшчэ дадаць, што Беразоўскі і Кавалёў зьяўляліся актыўнымі ўдзельнікамі кармянскага паўстаньня, за што брат Беразоўскага ў 1919 г. быў расстрэлян, і той факт, што Беразоўскі, выконваючы абавязкі старшыні сельскай КУД **украў 72 пуды абагуленага збожжа,** то яшчэ больш стане ясным, хто такі Беразоўскі і яго кулацкія паплечнікі. Цікава адзначыць той факт, што рад актыўных калгаснікаў з бядняцка-серадняцкай праслойкі ня раз сыгналізавалі раённым і сьледчым арганізацыям, але мер ніхто ня прыняў.

Дакуль-жа будуць заставацца непаканымі ворагі народу і чаму цацкаюцца з імі ў Кармяншчыне?

Праверыўшы.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае тэрміновых мер па аздараўленьні калгасу «Памяць Леніна».

Грамадзкае харчаваньне дрэнна арганізавана

(Ліст рабочага)

Рамонт трактараў і запасных частак мае зараз важнае гаспадарча-палітычнае значэньне. А між тым, **на заводзе «Рухавік рэвалюцыі»** (Гомель) неадпавядаюць усёй сур'ёзнасьці гэтай справы. Цякучасьць рабочай сілы, асабліва **кваліфікаванай,** павышае брак. У ліцейным цэху ён дасягае па поршнях і іншых дэталях 75 проц. Гэта пагражае зрыву такой адказнай работы, як рамонт трактараў.

Прычыны цякучасьці рабочай сілы кароніцца ў дрэннай арганізацыі грамадзкага харчаваньня. Сыгналы заводскага органу аб сталоўцы засталіся непачутымі. І зараз рабочыя часта за сталоўцы без абеду. Недаедаецца норма хлеба. Раскрадаюцца прадукты (макарон і інш.). Дыетычныя абеды апрыяліваюць трыкутнік заводу, мэйстры, інструктары, а ня хворыя рабочыя.

Санмінімум у сталоўцы адсутнічае. Вельмі часта ў страве можна бачыць каўзалкі дрэва, салому, валасы і г. д. Абеды амаль заўсёды сырыя. Аб такім становішчы сталоўкі ведае мэдпункт і яго кіраўнік доктар **Дубсон,** але яны нічога ня робяць.

Пастанова партыі аб стварэньні ўласнай харчовай базы на заводзе не ажыцьцёўлена. 50 га зямлі, якія лічацца за заводам, застануцца незасеянымі, бо яшчэ да гэтага часу насеньне не загатоўлена. Зямля ўвосень не ўзарана і прылад для гэтай работы няма. Ад дрэннага догляду сьвінні ў сьвінарнім пашыхлай. Тое-ж самае пагражае і трусом.

Грамадзкія арганізацыі заводу добра ведаюць аб гэтых фактах, але абмяжоўваюцца вынесьненым пастановаў, якія нікім ніколі не праводзяцца ў жыцьцё.

Трэйбух С.

АД РЭДАКЦЫІ: Чакаем ад Гомельскай РКК РСІ рэагаваньня на паданы факты і паведамленьня аб прынятых мерах.

Па сьлядох неапублікаваных лістоў рабочых і калгаснікаў

Заметка селькора **Гвоз д «Абаронца кулака»,** як паведамляе Слуцкі райсавыдзел, **адпавядае сапраўднасьці.** Настаўнік Душэйскі сапраўды хаваў збожжа і маемасьць свайго дзядзькі кулака. Зараз настаўнік Душэйскі, які працаваў старшынёй калгасу «Чырвоны партызан», **за злачынную дзейнасьць і абарону кулакоў выключан з калгасу.**

***

Матар'ял групы калгаснікаў аб злачынстве ў калгасе **«Авангард»,** Дрысенскага раёну, праверан, **факты адпавядаюць сапраўднасьці.** За злачынную работу **брыгадэір Снапок разам з усім праўленьнем калгасу зьнят з работы. Справа перадана ў суд.**

***

Допіс селькора «Вока» аб разбазарваньні прадуктаў і самаснабжэньні работнікаў Расьпянскага сельпажыўтаварыства, Мсьціслаўскай РКК-РСІ праверан і факты **пацьвердзіліся.** Старшыня сельпажыўтаварыства **Вольны зараз знаходзіцца пад вартай і прыцягваецца да судовай адказнасьці.** Апрача таго, РК КП(б)Б прымаюць меры да бесьперабойнага снабжэньня студэнтаў і настаўнікаў вэтэтэхнікуму.

***

Допіс т. **Цофіна—«Як Лёзна рэалізуе сельгасмашыны»** Лёзьнянскай РКК-РСІ праведзен, факты **пацьвердзіліся.** Загадчыку складу Сельгасснабу за дрэнную ахову машын **вынесена суровая вымова з папярэджаньнем.**

БРАК ПЛЫВЕ ПА КАНВЭЕРЫ

Аб'яднаны студзеньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) падкрэсьліў, што зараз асноўны ўпор павінен быць зроблен на паляпшэньне якасьці прадукцыі і рост прадукцыйнасьці працы ў прамысловасьці.

Гэта рашэньне не знайшло практычнага ажыцьцяўленьня ў рабоце віцебскай швейнай фабрыкі **«Прафінтэрн».** Прафінтэрнаўцы вельмі дрэнна змагаюцца за высокую якасьць польтаў.

Паводле пляну 1932 г. пераробкі на фабрыцы не павінны былі перавышаць 10 тыс. руб. На самой-жа справе, фабрыка на пераробкі выдаткавала 23 тыс., з якіх толькі 3 тыс. руб. вылічана з канкрэтных вінаватых у браку і пераробках. Такім чынам, у выніку невыкананьня пункту калдагавору аб 100 проц. вылічэньні за брак і пераробкі з канкрэтных вінаватых у гэтым, фабрыка мела 10 тыс. руб. страт.

Вытворчы брак, які, паводле пляну, не павінен перавышаць 1 проц. за 1932 г. дасягнуў на фабрыцы звыш 2 проц. Крывая браку і пераробак няўхільна расьце, прымаючы ўсё больш і больш пагражальныя разьмеры. Калі за студзень 1932 г. колькасьць пераробак у сярэднім дасягнула да 7 тыс., дык у студзені 1933 г. яна ўжо раўнялася 18 тыс.

На радзе апэрацый проста «спаборнічаюць» на большую колькасьць браку і пераробак. Так, рабочыя 86-й апэрацыі — ушыўка рукавоў — цэх польтаў па лепшай якасьці — **Багданава, Кашнікаў, Левін і Сьвірыдоўскі** — за студзень зрабілі 1.388 пераробак. На 88-й апэрацыі гэтага-ж цэху, рабочымі **Сонцавай і Крывашзевым** за два тыдні зроблена 605 пераробак. Работніца **Жарава** зрабіла 125 пераробак, **Іофэ** — 115 і г. д.

У цэху дзіцячых польтаў асабліва дрэнна выконваюцца апэрацыі — пад рэзка, вышыўка петляў, клапанаў, зашыўка бакавых швоў і інш.

10 лютага са складу зьвернута ў цэх 200 браковаых **жаночых польтаў,** якія цэхавая адміністрацыя прабавала здаць, як добраякасны прадукт. У цэху часта матар'ял заліваецца маслам, кішэні вышываюцца не стандартнай строчкай, нядбайна вышываецца кромка, дрэнна зашываюцца і разуцюкваюцца рукавы і інш.

Ня лепш і ў **цэху польтаў.** Першы вучастак, напрыклад, які перавыконвае прамфінплян па колькасных паказьніках, вельмі адстае па якасьці. Работніца **Сідарава** дрэнна зашывае бакі, работніца **Келасава** ставіць не стандартныя закрэпкі на кішэнях. Такіх фактаў можна прывесьці многа.

Значна садзейнічае пагаршэньню якасьці прадукцыі і закрыпная фабрыка **«Сьцяг індустрыялізацыі»,** якая забясьпечвае раскроем фабрыку «Прафінтэрн». Паўфабрыкат, які паступае з закройнай, ва многіх выпадках бракаваны, між тым, на ардэрох крою брак не паказан.

Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал большасьці цэхаў фабрыкі «Прафінтэрн» яўна ігнаруе якасьць пашыву. Прыёмшчыкі **Цыпернят, Хацянаў, Самуйлаў** (цэх жаночых польтаў) бескантрольна прапускаюць на склад бракаваныя вырабы. Інструктары ватнага агрэгату **Німчонак і Скупін** ня сочаць за ходам работы на вучастку, ня вучаць рабочых, асабліва новых, тэхніцы шыцьву. Яны зьняты з работы за фармальныя адносіны да якасьці прадукцыі.

Ёсьць і асобныя загадчыкі і намесьнікі загадчыкаў цэхаў, якія ігнаруюць заўвагі добраясумленных кантралёраў і прыёмшчыкаў. Так, калі 10 лютага прыёмшчык цэху дзіцячых польтаў **Файнштэйн** забракаваў пальто, дык загадчык цэху **Качурын** назваў яго шкоднікам і прапусьціў пальто, як добраякаснае.

Калі рабочыя паказваюць намесьніку загадчыка цэху польтаў **Лейкіну** на псаваньне ад апэрацый, ён у адказ заяўляе: «А вы лепш працуеце?»

Забылася пра якасьць прадукцыі і дырэкцыя фабрыкі, якая не патрабуе ад кожнага загадчыка цэху і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу цэхаў адказнасьці за становішча якасьці ў цэху.

Улік і давядзеньне кожнага выпадку браку і пераробак да канкрэтнага вінаватага на фабрыцы не наладжан. Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал фабрыкі займаецца фіксацыяй выпадкаў браку, складаньнем актаў і не дабіваецца прыцягненьня канкрэтных вінаватых да адказнасьці, не мабілізуе грамадзкую думку вакол кожнага выпадку псаваньня прадукцыі. Грамадзкія інспэктары па якасьці і таварыскі суд фабрыкі бязьдзейнічаюць. Вітрын якасьці прадукцыі на фабрыцы няма, вытворчыя нарады не праводзяцца. Шматлікія пастановы аб ажыўленьні работы грамадзкіх інспэктароў па якасьці і таварыскага суду засталіся на паперы. Ад трыкутнікаў вучасткаў ні партыйныя ячэйкі, ні цэхкамітэты не патрабуюць адказнасьці за становішча якасьці прадукцыі. Пасьля ўсяго гэтага, ня дзіва, што брак плыве па канвэеру, што адзін толькі цэх польтаў за студзень меў 11 тыс. пераробак.

Рад партыйцаў і камсамольцаў **(Левін, Сьвірыдоўскі, Іофэ),** замест таго, каб стаць на чале ў барацьбе за якасьць прадукцыі, псуюць яе, а пасобныя камсамольцы, нават, выведзены з ударнікаў і выключаны з радоў камсамолу **(Губэрман).**

Шматлікія пастановы аб пераглядзе складу адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і кантрольнага апарату з мэтай забясьпячэньня больш пага кантролю за якасьцю прадукцыі не ажыцьцяўляюцца.

Бюро рабочага вынаходніцтва і ячэйкі вынаходнікаў нічога ня робяць па зборы прапаноў па паляпшэньні якасьці прадукцыі. Павышэньне кваліфікацыі рабочых не наладжана.

Бюро партыйнага калектыву фабрыкі, займаючыся пытаньнем якасьці, не правярала, асабліва ў апошні час, выкананьня сваіх пастановаў, на цікавіцца становішчам якасьці прадукцыі, якую выпускае фабрыка «Прафінтэрн» і **Белшвэйаб'яднаньне.**

Так далей працягвацца ня можа. Кіруючыя арганізацыі фабрыкі павінны неадкладна арганізаваць барацьбу за павышэньне якасьці прадукцыі. Спажыўцы патрабуюць ад фабрыкі добра якасных польтаў.

Узьдзін, Ігольнікаў.

ПАСТАНОВА

прэзыдыуму ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ

аб правядзеньні дэкадніка вывазкі гною, збору попелу, сажы і адыходаў прамысловасьці для ўгнаеньня прыгарадных гаспадарак

У ажыцьцяўленьне дырэктывы ЦК КП(б)Б аб васіленьні тэмпаў вывазкі гною (у сувязі з тым, што па БССР на 10-III—1933 г. плян выкананя усяго на 37 проц.), збору попелу (на 10-III плян выкананя на 11 проц.), сажы і адыходаў прамысловасьці для ўгнаеньня палёў прыгарадных гаспадарак, — прэзыдыум ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ **пастанаўляюць:**

1. З 17 па 27 сакавіка правесьці па БССР дэкадник вывазкі гною, збору попелу, сажы і адыходаў прамысловасьці, якія могуць быць скарыстаны для ўгнаеньня палёў.

2. Абавязаць ГРПС, ЦП саюзаў, гаркомы і райкомы ЛКСМБ, ФЗМК, ячэйкі КСМ і жакты тэрмінова разагрунцаваць вакол правядзеньня дэкадніка шырокую масава-растлумачальную работу ся рэд рабочых прадпрыемстваў, камсамольскіх і піянэрскіх арганізацый, жыхароў жактаў, жонак рабочых і школьнікаў, паставіўшы задачай 100 проц. актыўны удзел іх у правядзеньні дэкадніка.

Арганізаваць брыгады для падворнага абходу па збору попелу, сажы і інш., адшуканьня дадатковых крыніц мін. угнаеньняў і адыходаў, годных для ўгнаеньня, і арганізацыі вывазкі іх на палі калгасаў.

3. Абавязаць кіраўнікоў устаноў, прадпрыемстваў і жактаў арганізаваць збор попелу, сажы і інш. адыходаў, годных для ўгнаеньня, а таксама без затрыманьня пераправаць наяўны ў іх гной і попел адпаведным калгасам.

4. ГРПС. райкомам ЛКСМ сумесна з гарсаветамі вызначыць раёны гораду і прадпрыемствы для пасобных калгасаў і абавязаць дырэктароў апошніх арганізаваць штодзённую вывазку ў калгасы попелу і адыходаў прамысловасьці з адпаведных ім вучасткаў гораду.

5. Абавязаць ГРПС сумесна з гарсаветамі мабілізаваць на час дэкадніка, тэрмінам на 10 дзён, увесь гарадскі і фабрычна-заводскі аўтагужтранспарт для вывазкі гною, прымацаваўшы да кожнага калгасу і гарадзкога вучастку пэўную колькасьць мабілізаванага транспарту і давесьці да яго плян вывазкі гною.

6. Прапанаваць рэдакцыям шматтыражак і насьцэнгазэт уключыцца ў правядзеньне дэкадніка, мабілізуючы ўвагу рабочых на пасьпяховае яго правядзеньне, 100 проц. выкананьне пляну вывазкі ўгнаеньняў, збору попелу, лаючы рашучы адпор асобам, ігнаруючым здачу і збор калгасам гною і попелу.

7. Для кіраўніцтва дэкадникам арганізаваць у гарадах: Менск, Віцебск, Гомель, Бабруйск, Магілеў, Ворша, Полацак, Барысаў, Мазыр — апэрацыйныя тройкі ў складзе: старшыні ГРПС, сакратара РК КСМ, нач. міліцыі (ён-жа прадстаўнік гарсавету).

Абавязаць тройкі з атрыманьнем гэтай пастановы правесьці:

а) улік усяго гарадзкога і фабрычна-заводскага транспарту, прымацаваць яго да кожнага калгасу, даўшы плян вывазкі гною і попелу на 10 дзён, выходзячы з поўнай нагрузкі каня;

б) вызначыць асобныя вучасткі гораду для арганізацыі ў іх збору і вывазкі гною і попелу для пасобных калгасаў, скарыстоўваючы для гэтай мэты жактаўскі актыў, піянэрскія арганізацыі, дарослых рабочых, жонак рабочых і школьнікаў;

в) штодзённы і штогадзінны кантроль за сапраўднай арганізацыяй збору і вывазкі ўгнаеньняў на палі калгасаў;

г) асоб, сабатуючых справу збору і вывазкі ўгнаеньня, прыцягваць да суровай адказнасьці, аж да перадачы суду;

д) даваць кожныя 2 дні тэлеграфныя весткі ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ аб ходзе дэкадніка.

8. Прасіць рэдакцыі цэнтральных і раённых газэт уключыцца ў абвешчаны дэкадник і арганізаваць рабкораўскія рэйды праверкі ходу правядзеньня дэкадніка.

Згодна пастановы сакратарыяту ЦК, на 21 сакавіка агітмасам ЦК скліканецца

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА РАЙЖАНАРГАНІЗАТАРАЎ

ПА ПЫТАНЬНЯХ:

1. Задачы работы сярод сялянак ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

2. Аб паляпшэньні бытавога абслугоўваньня калгасьніц.

На нараду выклікаюцца ўсе райжанарганізатары ГК і РК КП(б)Б.

АГІТМАС ЦК КП(б)Б.

Сёньня в 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦК КП(б)Б (заля пленуму)

адбудзецца пасяджэньне **ПЛЕНУМУ Менгаркому КП(б)Б**

ПАЗАМ З САКРАТАРАМІ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ І ЯЧЭЕК гор. Менску.

Члены і кандыдаты ПЛЕНУМУ Гк праходзяць па сваіх мандатах. Сакратары партколектываў і ячэек атрымліваюць білеты ў памяшканьні ГК КП(б)Б 19-га сакавіка з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дня, пакой № 32.

МЕНГАРКОМ.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Напярэдадні ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

20 і 21 сакавіка ў Менску будуць арганізаваны сустрэчы дэлегатаў з лепшымі ўдарнікамі прадпрыемстваў.

Калгасьнікі асобных раёнаў прымацоўваюцца да асобных фабрык і заводаў. Так, напрыклад, да гарбарні «Бальшавік» будуць прымацаваны тры раёны, пэўныя раёны прымацоўваюцца да заводу імя Варашылава, «Камунар» і г. д.

Партыйныя, прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі гэтых прадпрыемстваў адзначаюць за сустрэчу дэлегатаў, абслугоўваньне ў часе работы зьезду і г. д.

Дэлегаты 1-га ўсебеларускага зьезду наведаюць завод «Камунар», Эльвод, АТС, Дзяржмуэй, дом ураду і рад іншых прадпрыемстваў і культурных устаноў.

На 12 прадпрыемствах Менску будуць наладжаны ўрачыстыя вечары — сустрэчы дэлегатаў.

Горад, вакзал, пляцы ў дні зьезду будуць ўпрыгожаны плякатамі, лёзунгамі.

Выпучаны спэцыяльныя фота-брыгады для абслугоўваньня дэлегатаў, арганізацыі фота-вітрын і работы на прадпрыемствах у часе зьезду. Большасьцю прадпрыемстваў будуць падрыхтаваны выстаўкі шырспажыву. 20 і 21 сакавіка выпускаюцца спэцыяльныя нумары насьценгазэт, прысьвечаныя Ўсебеларускаму зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Калдагаворная кампанія

* ЦП саюзу мукамолаў падпісала генэральныя згоды на 1933 год з Белпрамхлебам, БелКМО па кандытарскай прамысловасьці, Белканторай Саюзкрупы і Саюзмукі.

У згоды ўключаны спэцыяльныя пункты аб клясавай пільнасьці, аб барацьбе з раскраданьнем дзяржаўнай маемасьці і г. д.

Для правядзеньня калдагаворнай кампаніі ў раёны камандыравана 6 работнікаў з апарату ЦП саюзу і 12 з гаспадарчых арганізацый.

Праверка калдагавораў 1932 г. па саюзе мукамольна-кандытарскай прамысловасьці заканчваецца.

* Для кіраўніцтва калдагаворнай кампаніяй **пры Менгарпрафсавеце** створана апэрацыйная тройка. Арганізуецца штодзённая кансультацыя па пытаньнях перазаключэньня калдагавораў.

За 41.480 тон гароднінны

Прыгарадныя гаспадаркі БССР павінны даць у 1933 годзе 41.480 ТОН ГАРОДНІНЫ І РАНЬНЯЙ БУЛЬБЫ, 4.057 ТОН ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР І 25.300 ТОН ПОЗЬНЯЙ БУЛЬБЫ.

Для выкананьня гэтай задачы неабходна асвоіць падгароднія культуры 3.422 га, у тым ліку пад раньнюю бульбу 1.122 га, пад збожжавыя і кармовыя культуры 12.411, у тым ліку пад бульбу позьнюю 2.300 га.

У мэтах разгортваньня шырокай актыўнасьці рабочых і ІТР, калгасаў і прадпрыемстваў у барацьбе за бальшавіцкія тэмпы правядзеньня веснавой сяўбы, праполкі і ўборкі, прэзыдыум ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, Белкаапсаюз, Нарканпёгпрам, Наркамцяжпрам, Наркамснаб і Наркамлес абвяшчаюць УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ С.-Г. КАМПАНІІ ў ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ у 1933 г.

Для прэміяваньня лепшых калгасаў, брыгад, рабочых-ударнікаў вызначан прэміяльны фонд у 10.000 РУБ.

Хроніка

* Каля 23 тыс. бясплатных пуцёвак у дамы адпачынку атрымаюць сёлета прафсаюзы БССР. У першым квартале страхкасамі БССР адпраўлена ў санаторыі і на курорты 730 членаў прафсаюзаў.

* VI пленум ЦК МОПР'у БССР скліканецца 23 сакавіка ў Магілеве. Пленум заслухае даклад аб выніках абсьледваньня мопраўскай арганізацыі Беларусі і абгаворыць пытаньне аб узмацненьні работы ячэек МОПР'у на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах.

* Выстаўка, прысьвечаная 50-годзьдзю з дня сьмерці Карла Маркса, адкрыта ў беларускім дзяржаўным сацыяльна-гістарычным музэі ў сэктары «Капіталізм на Беларусі».

* Разглядаць справы зрыўшчыкаў вывазкі гною на працягу 24 гадзін абавязаў Менскі гарсавет і гарпракурора і нарсуды.

* Аддзел радыёвяшчаньня арганізаваў пры Менскім гарсавеце. Для радыёфікацыі сельсаветаў і калгасаў адпушчана 6.500 руб.

УМОВЫ ПРЫЁМУ

на аддзяленьне сакратароў вытворчых партколектываў курсаў райпартактыву пры ЦК КП(б)Б

1. Аддзяленьне рыхтуе сакратароў вытворчых партколектываў.

2. На аддзяленьне сакратароў вытворчых партколектываў 6-месячных курсаў РПА прымаюцца члены партыі па камандыроўках РК КП(б)Б з трохгадовым партстажам і аднагадовым стажам партработы (сакратар ячэйкі, член Бюро ячэйкі), маючыя агульную адукацыю ў аб'ёме 4-х груп сямігадовай школы і па літыцную ў аб'ёме ВСПШ.

УВАГА: З ліку камандыраваных павінна быць жанчын ня менш 30 проц. і рабочых па сацыяльным становішчы ня менш 70 проц.

3. За курсантамі і іх сем'ямі захоўваецца пэнсія і ўсе астатнія віды матар'яльнага забясьпячэньня па месцы іх ранейшай работы.

4. Курсанты на курсах забясьпечваюцца: харчаваньнем, інтэрнатам, пасьцельнымі прыладамі і вучэбнымі дапаможнікамі.

5. Заняткі пачнуцца 15 красавіка 1933 году, да якога тэрміну ўсе запрошаныя на курсы павінны зьявіцца ў гор. Менск, курсы РПА. Прыём камандыраванняў і дакумантаў — да 1 красавіка 1933 г. у канцылярыі курсаў—г. Менск, тэрыторыя былой выстаўкі, курсы райпартактыву пры ЦК КП(б)Б.

5. Разам з камандыроўкай павінны быць даданы наступныя дакументы:

а) анкета, завераная РК КП(б)Б;

б) даведка аб стане здароўя;

в) даведка аб атрымліваемай пэнсіі і ліку ўтрыманцаў.

Устанавіць наступную разьвёрстку па раёнах:

Аршанскі	— 5
Асіпавіцкі	— 1
Бабруйскі	— 8
Барысаўскі	— 10
Віцебскі	— 12
Гарадоцкі	— 1
Гомельскі	— 12
Дубровенскі	— 2
Жлобінскі	— 3
Клімавіцкі	— 1
Крычаўскі	— 2
Магілеўскі	— 10
Мазырскі	— 5
Менскі	— 15
Рагачоўскі	— 3
Рэчыцкі	— 3
Слуцкі	— 2
Сураскі	— 2
Чашніцкі	— 2
Шклоўскі	— 3

Сакратар ЦК КП(б)Б ЖАБРОЎСКІ.
Заг. аргадзьдзелу ЦК КП(б)Б КАРТУКОЎ.
Загалчык курсаў РПА пры ЦК КП(б)Б МАКОЎСКІ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ФІЗЫКА-МАТЭМАТЫЧНАЯ — АСАЦЫЯЦЫЯ ПРЫ БАН.
Інстытут філёзофіі БАН.

20 сакавіка, у 6 гадз. вечара, у фізычным корпусе БДУ

АДБУДЗЕЦЦА

ПАСЯДЖЭНЬНЕ

прысьвечанае 50-годзьдзю з дня сьмерці Карла Маркса.

З ДАКЛАДАМ т. **НАХІМСОЎСКАЙ** НА ТЭМУ:

„Аб матэматычных рукапісах Карла Маркса"

ПАСТАНОВА

прэзыдыуму менскага гарадзкога савету ад 19-III-1933 г.

Аб расцэнках за перавозку грузаў па гораду Менску гужтранспартам

1. Устанавіць наступныя граніцы расцэнкі за перавозку грузаў па гораду Менску на 1933 год:

1-ы раён на адлегласьці да 1 клм.— 5 руб. за тону.

2-гі раён на адлегласьці да 2 клм.— 7 р. за тону.

3-ці раён на адлегласьці да 3 клм.— 9 р. за тону.

4-ы раён на адлегласьці да 4 клм.— 12 р. 90 к. за тону.

5-ы раён на адлегласьці да 5 клм.— 16 р. 30 к. за тону.

6-ы раён на адлегласьці да 6 клм.— 19 р. 60 к. за тону.

Сярэдня-дзённую граніцную каштоўнасьць конедня ўстанавіць у 49 руб.

Паказаныя расцэнкі устанаўляюцца для гужтранспартаў, якія не атрымліваюць фураж у цэнтралізаваным парадку па цьвёрдых цэнах. Памянёныя расцэнкі паніжаюцца для гужтранспартаў, якія забясьпечваюцца фуражом у цэнтралізаваным парадку за кожны атрыманы кгр. аўса на канят ў дзень на 9 проц., на кожны атрыманы кгр. сена на каня ў дзень на 1 проц. (округлі валічваюцца 2 кгр. за 1 кгр. аўса). Пры забясьпячэньні гужтранспарту аўсом па 5 кгр. на каня ў дзень і сена 10 кгр. на каня ў дзень у цэнтралізаваным парадку расцэнкі паніжаюцца на 55 проц. Далейшаму паніжэньню расцэнкі не падлягаюць.

2. Паказаныя расцэнкі ўстанаўляюцца з пагрузкай і выгрузкай усіх гарных і мясцовых грузаў вагой да 200 кгр. у адным месцы і бачковых да 300 кгр. у адным месцы і за перавозку длінамернага будаўнічага матар'ялу даўжынёй да 9 мэтраў.

3. За перавозку длінамернага будаўнічага матар'ялу (звыш 9 мэтраў) расцэнка павялічваецца ў 1-м раёне на 45 проц., у другім раёне на 30 проц., у 3-м раёне на 25 проц., у 4-м раёне на 20 проц., у 5-м і 6-м раёнах на 15 проц.

4. Расцэнка пры развозцы грузаў больш як у 3 месцы павышаецца на 20 проц.

5. За перавозку экстрату, цэмэнту, насьпіцу, цэглы, клінкі і іншых тавараў, патрабуючых укладкі, расцэнкі павышаюцца на 5 проц., за перавозку цэны на 10 проц.

Пры перавозцы лёгкавалкіх грузаў, якіх на падводу нельга зьмясьціць вышэй тоны, расцэнкі ўстанаўліваюцца за рэйс як за перавозку адной тоны.

6. За перавозку яшчэ расцэнкі павышаюцца на 10 проц., гравію і камня на 15 проц., тлёны на 15 проц.

Пры расцэнках за кубамэтр, прыведзеныя вышэй расцэнкі за тона-кілёмэтр памнажаюцца на ўдзельную вагу (гліна 2, камень 2,5, пясок 1,5, зямля 1,9, гравій 2,3 і г. д.).

7. Забараніць усім арганізацыям плаціць за перавозку грузаў вышэй устаноўленых граніцных расцэнак.

Абавязаць транспартныя арганізацыі строга прытрымлівацца ўстаноўленых гэтай пастановай расцэнак.

Даручыць транспартнай секцыі гарсавету мець сыстаматычны кантроль за выкананьнем гэтай пастановы.

Пастанова ўваходзіць у моц з дня яе апублікаваньня.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету ВАЛОДЗЬКА.
Сакратар Менгарсавету ЯГОЎДЗІК.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)
Мост кіраўн. ЛІТВІНАЎ.
Л. і П. ТУР.
СЁНЬНЯ
ЗЯМЛЯ І НЕБА
п'еса ў 4-х дзеях.
Пачатак у 8 г.

Помяшк. яўр. Дзярж. Тэатру
(вул. Валадарскага, 7, тэл. 21-813)
Адноўленая праграма
МЮЗІК-ХОЛ
Пачатак—8 г. 30 м. вечара.
Штодзённа адно выступленьне ў двух вялікіх аддзяленьнях.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" КАСА—ад 1 г. дня
НАЕЗЬНІК в УАЙЛЬД-ВЭСТА 2 сэрыя ў адзін сэанс.
Гукавая праграма 1) БЯГЛЕЦ, 2) Паравоз, ляці наперад.
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 12 г. дня
Мастацкі фільм ДАЧКА РАФКЭ
ПРАЛЕТАРЫ
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ЧУЖАЯ Драма ў 6 ч.
„СПАРТАК" КАСА—ад 1 г. дня
Замежны фільм ДОННА ЖУАНА Камэдыя ў 9 частках.

Лазьня-пральнае кіраўніцтва г. Менску
паведамляе,
што для лепшага абслугоўваньня насельніцтва
ЛАЗЬНІ
АДКРЫТЫ
КОЖНЫ ДЗЕНЬ
з 8 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы, а продаж білетаў праводзіцца з 8 г. раніцы да 11 з палов. г. ночы.
Дырэктар трасту МАРГОЛІН.

СЭКТАР КАДРАЎ ВОСУ
АРГАНІЗУЕ
ГРУПУ РАХУНКАВОДАЎ
для раёну для сыстэмы
БЕЛКААППРАМСАВЕТУ.
Стыпэндыя ад 40 да 80 руб. у месяц і квэтэрных 20 руб. Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.
Заявы з дакумантамі: аб сацстановішчы, аб адукацыі (ня ніжэй 6-ці груп), аб узросьце (ня менш 17 год), а для калгасьнікаў згоду праўленьня, прымаюцца ў канцылярыі ВОСУ (Менск. Камуністычная, 16, 10-ты паход) ДА 30 САКАВІКА ад 12 да 2 гадз. штодзённа. Заявы бяз пералічаных дакумантаў разглядацца ня будуць. Курсанты прымаюцца да сталоўкі.

МЕНСКАЯ КАНТОРА
Белплодагароднінны
просіць усіх здатчыкаў садова-гароднай прадукцыі (саўгасы, калгасы і аднаасобнікі) Менскага і Заслаўскага раёнаў
АТРЫМАЦЬ не пазьней 1-га красавіка
РАЗЬЛІКІ
па ўсіх пастаўках:
ВЛЕНВЕДУ, НА СКЛАДЫ БЕЛПЛОДАГАРОДНІНЫ І Г. Д.
Разьлікі робяцца штодзённа, за выключэньнем выходных.
Здатчыкі Заслаўскага раёну атрымліваюць разьлікі ў Заслаўскім аддзяленьні Белплодагароднінны.

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі
СЭКТАР КРІТАГАНДЛЮ
Вышла з друку і разаслана падпісчыкам часопісь
Камуністычнае Выхаваньне 1933 г, № 1
(цана асобнага нумару 1 р.)
Друкуецца і ў хутнім часе выйдзе часопісь
„КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ"
№ 2 (люты 1933 г.)
Орган Наркамасьветы і ЦП Саюзу працасьветы БССР
ЗЬМЕСТ НУМАРУ:
Вынікі першай пяцігодкі. (Даклад т. Сталіна на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) 7 студзеня 1933 г.).
В. Г. Рудніцкі—Вынікі першай пяцігодкі нацыянальна культурнага будаўніцтва БССР.
Палітэхнічная школа — да бальшавіцкай сяўбы
Х. Сьцепанюк—Чарговыя задачы веснавой пасяўкампаніі.
М. Калінічэнка—Мэтадычная распрацоўка праграмнага матар'ялу школ 1 канцэнтру, у сувязі з чарговымі задачамі бальшавіцкай веснавой сяўбы.
М. М. Лазарэнка—Прышкольныя вучасткі ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.
За тэхніку пэдагагічнага працэсу
П. О. Афанасьеў—Як падрыхтавацца да ўроку.
С. Равін—Геаграфія ў IV групе, (Мэтадычная распрацоўка тэмы „Зона пустынь")
І. Марголін (Арнопьдзі)—За сыстэматычную пэдпрапаганду.
І. Е.—Нумарацыя да 1.000 (Узорная лекцыя, праведзеная ў II групе 34-й Менскай ФЗС).
І. Д. Лавейка—Фізкультура—арганічнае зьвяно Нарасьветы.
Л. Ганкін—Мастацкія элементы ў палітвыхаваўчай рабоце школы (на ўрэйскай мове).
Крытыка і бібліяграфія
З. А. Сташонак—Аб падручніку гісторыі для 5 кляс сы ФЗС і ШКМ, ч. 1—Г. Я. Кахноўскага, П. Лубоўскага і інш.
В. В. Захараў—За падручнік патрэбны савецкай школе! (Рэцэнзія на падручнік „Рабочая кніга па прыродазнаўству" Кобзіга і Ратковіча).
Я. З.—Рэцэнзія на антырэлігійную хрэстаматыю для I канцэнтру „Юны бязбожнік"—Хайтуна, Капаевіча і Фрэйдмана.
Інфармацыя—хроніка.
Інструкцыйны ліст аб парадку правядзеньня гадовых праверачных іспытаў пры пераводах і выпусках вучняў
Прыём падпіскі на 1933 г. працягваецца
Падпіска прымаецца ўсімі Райбюро, Гарбюро і газэтнымі кіёскамі Саюздруку:
ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
На 12